Кампартыя (бальшэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 263 (5096)
ЛІСТАПАДА
24
СУБОТА
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СВАВОЛЬСТВА ЯПОНСКАГА ВАЕННАГА КАМАНДАВАННЯ НА КУЧ

ХАБАРАЎСК, (БЕЛТА). З Харбіна паведамляюць аб радзе фактаў, якія ілюструюць прадаўжаючыеся свавольства японскага ваеннага камандавання на КУЧ, у прыватнасці па усходняй лініі.

2-га верасня ў часе работ японскіх вайсковых чыноў па падвешванню правадоў на ўчастку ад Харбіна на ўсходнім напрамку, работы, якія праводзіліся пад аховай японскага бронепоезда, была падпалена пуцевая казарма закрытага разъезда Медзежый. Першы падпал быў патушэн дапаможным поездам ст. Хэндаохэдзы. На наступны дзень гэта-ж казарма загарэлася два разы і ў канцы згарэла.

Бачыўшы падпал казармы суправаджаючы бронепоезд чытуначны агент Лютэйн быў арыштаваны. Ён падвергаўся жэнню і ў сучасны момант знаходзіцца по вялічэнні ў большыні.

На наступны дзень ардэль рабочых тэлеграфных ліній была перакінута на перагон Хэндаохэцзы—Шаньшы, дзе пасля праходу бронепоезда загарэлася пуцевая казарма на 1.212 клм. Калі пуцявы вартаўнік заўважыў пажар і паспяшыў к казарме, каб патушыць яго, то ён не быў дапушчан к будынку і быў збіт японскімі салдатамі.

АРГАНІЗАВАЦЬ ЗАГАТОЎКІ ПЯНЬКІ

Бурны рост нашай прамысловасці з кожным годам прад'яўляе ўсё большыя патрабаванні да канапляводчай гаспадаркі. Не прыходзіцца даказваць, якое велізарнае значэнне набываюць каноплі ў справе забеспячэння сыравой пяньковай прамысловасці, снабжэння рыбнай гаспадаркі сецямі, сельскай гаспадаркі снопавязальным шпагатом, а таксама ў выробе канатаў, мяшкоў, брэзенту і т. д.

Вось чаму саюзны ўрад у сваіх рашэннях аб развіцці канапель падкрэсліў, што «справе вытворчасці і апрацоўкі пянькі павінна быць аддана такая-ж увага, як вытворчасці і апрацоўцы ільну і іншых важнейшых тэхнічных культур».

У мэтах большай гаспадарчай зацікаўленасці калгасаў, калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў у развіцці канапляводчай гаспадаркі, партыя і ўрад устанавілі рад значных ільгот для здатчыкаў пянькі.

Аднак, практыка паказвае, што ўборцы і апрацоўцы канапель у большасці раёнаў БССР, нават канапляводчых, не аддаюцца амаль ніякай увагі. Гэта справа прадастаўлена самацёку. Кантроль Наркамзема і загатоўчых органаў за работай рабочых арганізацый, праўленняў калгасаў у справе апрацоўкі канапель зусім недастатковы.

Аб гэтым ясна сведчаць лічбы аб ходзе загатовак і апрацоўкі пянькі. **На 15 лістапада па БССР план загатовак пянькі выканан толькі на 39,4 проц.** У мачыльных ямы, па даных Наркамзема, на тое-ж чысло было закладзена 96,7 проц. канапель, вынута з ям 80,7 проц.

Трэба проста сказаць, у большасці раёнаў у адносінах канапель кіраўнікі раённых партыйных і совецкіх арганізацый, праўленні калгасаў прытрымліваюцца строгай чарговасці — спачатку бульбу, потым лён, а потым ужо каноплі.

Каб упэўніцца, што справа стаіць іменна так, даволі больш уважліва прааналізаваць ход загатовак.

У Беларусі на асушаных Мар'інскіх балотах арганізован буйнейшы канапляводчы соўгас імя 10-годдзя БССР. **Удзельная вага соўгаса ў агульным плане пяньказагатовак перавышае 10 проц.** Што-ж мы маем на справе?

У выніку агіднай безгаспадарчасці, адсутнасці ўсякай адказнасці за даручаную справу, соўгас (дырэктар **Прорвіч**) злачынна зрывае пеньказагатоўкі.

Соўгас здаў на 15 лістапада толькі 5 проц. належачай з яго прадукцыі.

Якое становішча ў асноўных канапляводчых раёнах. Вось **Касцюковіцкі** раён. На тэрыторыі раёна ёсць пяньковы завод. Прадукцыю раён здае трастой. Не гледзячы на гэта, план здачы пянькі выканан па 15 лістапада толькі на 22 проц.

З поспехам правёўшы загатоўкі ільну, кіраўнікі Касцюковіцкага раёна зусім забылі пра пяньку. З мачыльных ям вынута толькі 45,7 проц. канапель. Яшчэ горшае становішча ў суседнім **Клімавіцкім** раёне. План загатовак выканан усяго на 14,2 проц. З мачыльных ям вынута толькі 59,6 проц. канапель. Да далейшай апрацоўкі яе нават не прыступалі.

Або ўзяць такі канапляводчы раён, як Чырвонапольскі. 75 проц. прадукцыі ён таксама здае трастой. З мачыльных ям ужо вынута 92,3 проц. канапель, а план загатовак выканан усяго на 9 проц. Каноплі не апрацоўваюцца. Без усякага руху ляжаць і вынутыя з мачыльных ям каноплі ў **Кармянскім, Хойніцкім, Прапойскім** і радзе іншых раёнаў.

Агіднае становішча мы маем у Парыцкім раёне. Па даных райземаддзела на 15 лістапада з мачыльных ям вынута 99 проц. канапель. Ужо атрапавана 135 проц. пянькі, а план загатовак выканан усяго на 34 проц.

Тут мы маем справу з яўным кулацкім сабатажам загатовак пянькі. Кулацкія, класава-варожыя элементы імкнуцца запрэпяцуць апрацоўку пянькі да вясны з тым, каб лягчэй было разбазарыць гэту каштоўнейшую прадукцыю. Раённыя работнікі сваёй бяздзейнасцю толькі патураюць гэтаму кулацкаму сабатажу.

Што зараз рашае выкананне плана пеньказагатовак. Першае—няўхільнае выкананне пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб льготах здатчыкам пянькі. За кожны зданы центнер пянькі, валакна калгасы атрымліваюць тры центнеры хлеба па цвёрдых дзяржаўных цэнах. а калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі па 2.5 цэнтн. Апрача гэтага пеньказдатчыкі атрымліваюць алей і макуху. Аб гэтых ільготах павінен ведаць кожны калгаснік і аднаасобнік. Хлеб, атрыманы за пяньку, павінен размяркоўвацца паміж калгаснікамі, занятымі па мочцы, сушцы і трэпцы канапель. За выкананне дзённай нормы апрацоўкі канапель кожны калгаснік атрымлівае два працадні. Вось гэтыя важнейшыя вагары стымулявання апрацоўкі і здачы пянькі павінны быць неадкладна прыведзены ў рух.

Другая, не менш важная задача — захаванне агратэхнічных правіл апрацоўкі канапель. 20 проц. канапель яшчэ знаходзяцца ў мачыльных ямах. Трэба зараз-жа ўстанавіць пільны нагляд за мачыльнымі ямамі, каб недапусціць перамочкі, кантроль праводзіць два разы ў суткі, браць невялікія пробы з розных месц, хутка высушваць і прабаваць на мялцы. Пасля выемкі каноплі сушацца ў конусах пры сухім надворі не менш 2-3 дзён. У сёўнях тэмпература не павінна перавышаць 50 градусаў. Пасля сушкі абавязкова адлежка трасты на працягу 4-6 гадзін. Гэта паляпшае якасць да аднаго нумара і павялічвае агульны выхад валакна да 3 проц. Перад пасадкай у сёўню і перад мяццём, таксама як і на ільне, абавязкова сартаванне трасты па гатунках. У мялку траста падаецца верхавінкамі сцябла, невялічкімі жменямі па 200-300 грам.

Стымуляванне пеньказдатчыкаў і калгаснікаў, занятых на апрацоўцы канапель, прымяненне агратэхнікі — вось што зараз рашае паспяховае завяршэнне пеньказагатовак.

Раённыя арганізацыі павінны пакінуць ролю пасіўных назіральнікаў і па-большэвіцку арганізаваць перапрацоўку і здачу пянькі дзяржаве, даючы бязлітасны адпор кулацкім элементам, працуючым сарваць пеньказагатоўкі.

МЕНСК ПЕРАВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛАН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО; СНК БССР—тав. САК'ЯНУ, НКФ БССР—тав. ХАЦКЕВІЧУ

Уключыўшыся ў вытворча-фінансавы паход імя XI усебеларускага і VII усесаюзнага з'ездаў советаў, г. Менск і раён выканалі гадавы план мабілізацыі сродак у 21,7 млн. руб. 20 лістапада на 100,8 проц.

Разгортваем барацьбу за перавыкананне плана IV квартала, за права рапарту з'езду советаў і тав. **Молатаву.**

Старшыня горсовета ЖУКОВІЧ.
Старшыня арг. бюро райвыканкома ТУРЭЦКІ.
Заг. гарфа ЗАЛЕСКІ.

ВЫБЯРЭМ У СОВЕТЫ ЛЕПШЫХ ЛЮДЗЕЙ КРАІНЫ

Варашылаўны слухаюць справаздачны даклад. НА ЗДЫМКУ: Старшыня дэпутацкай групы завода — брыгадзір слесарна-аборачнага цэха НАГОСКІ і маладзён рабочы ўпершыню ўдзельнічаючы ў перавыбарах советаў — тт. ХОРНАС і ШАХНОВІЧ.

ГОДНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА

У памяшканні Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра 1.500 месц, але ў праходах, каля сцен усюды стаяць выбаршчыкі. Гэта армія студэнтаў палітэхнічнага інстытута атрымала магчымасць вучыцца і жыць у сталіцы Совецкай Беларусі.

Лепшай ілюстрацыяй да даклада тав. **Ленцнера** аб рабоце горсовета служыць гэта перапоўненая зала. У гэтай зале ў кожным радзе відаць прычэсы модны берэт, вуалетку, добрую прычоску, галштук, чысты каўнерык, ботпалюш. У гэтай зале няма набрытых твараў, таксама як няма твараў сумных. Калі ўваходзіш у гэту залу, мімаволі падпарадкоўваешся пачуццю, якое пануе ў ёй. Пачуццю годнасці чалавека, культурнага чалавека, чалавека з цудоўным будучым.

У палітэхнічным інстытуце 1.036 студэнтаў — былых рабочых, 15 проц. студэнтаў калгаснікаў. 163.000 руб. кожны год выдаткоўвае бюджэт на стыпендыі. Пачуццё годнасці чалавека ў паступіўшага зараз у інстытут старога кацельшчыка 40-гадовага ўзросту, які сядзіць у першых радах, перарастае ў пачуццё другой маладосці. З такім пачуццём сядзяць у прэзідыуме сівавалосы праф. **Краўцоў** і буйнейшы вучоны хімік праф. **Прылежаеў.** Пачуццё годнасці чалавека ўладае над усімі выступленнямі па дакладу горсовета.

Студэнты абураюцца тым, што ў лазню ім прыходзіцца хадзіць уночы. Студэнты патрабуюць сабе ў інтэрнаты тэлефоны. Тав. Яцкевіч скарджыўся на тое, што ваганважатыя ў трамваі часамі бываюць грубымі і крычаць: «Ну, садзіся хутчэй, адпраўляю!».. Чалавек законна патрабуе да сябе павагі. Больш за ўсё дасталося гарадскому трамваю. Студэнт вышэй усяго цэніць свой час, які ён не хоча траціць марна, чакаючы трамвая. Культура часу — ці не сведчыць гэта аб культуры быту?

Не дзіва, што тав. **Лосеў** патрабаваў пансіяцыі радыёканцэртаў у інтэрнат. Характэрна, што студэнтка пратэставала супроць бруду на Украінах не толькі таму, што там пэцкаюцца туфлі, якія яна не можа бачыць, брудзімі, але і таму, што з брудзімі нагамі культурнаму чалавеку непрыемна садзіцца ў чысты вагон трамвая. Студэнты пратэставалі супроць сістэмы выключна калектыўных ільготных наведванняў кіно. Ім хочацца бываць у кіно часцей і не заўсёды ў вялікай кампаніі. Людзі патрабуюць увагі да сваіх жаданняў.

Зала апладыравала, калі трагучэлі патрабаванні адкрыць у студэнцкім гарадку катэк, адкрыць у студэнцкім гарадку кіёск, дзе можна было-б купіць любы журнал, папырыць бібліятэку і чытальні студэнцкага гарадка.

Пад знакам большэвіцкай дзелавітасці і самакрытыкі прайшоў справаздачны сход.

З'ЯВІЛІСЯ УСЕ ЯК АДЗІН

ОРША, 22. (Па тэлефону).

Справаздачна - перавыбарчая кампанія па гораду ў поўным разгары. Ужо адбыліся выбарчыя сходы на буйнейшых прадпрыемствах горада — **мясакамбінаце, будаўніцтве ільнокамбіната, заводзе «Спартак», механічным заводзе, хлебакамбінаце** і на іншых прадпрыемствах.

З вялікім уздымам прайшлі выбары на мясакамбінаце. З 554-х выбаршчыкаў з'явіліся 552 чал. —99,3 проц. На будаўніцтве ільнокамбіната з 560 рабочых прысутнічала 556 чал., на заводзе «Спартак» з'явіліся ўсе рабочыя.

Толькі адзін хлебазавод даў яўку 88 проц.

Справаздачы горсовета выклікалі па ўсіх прадпрыемствах вялікую актыўнасць выбаршчыкаў. Рабочыя многа гаварылі аб дрэнным рабоце валапрывода, лазняў, невыкананні промфінплана паасобнымі прадпрыемствамі; работніцы скарыліся на дрэнную работу медыцынскіх пунктаў на ільнокамбінаце і іншых заводах.

ГУРЭВІЧ

НА СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАХ

ГОМЕЛЬ, 22. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Першы дзень справаздач горсовета — 20 лістапада — паказаў актыўнасць рабочых мас, выкананых узятыя на сябе абавязацельствы. Рабочыя фабрыкі «Камітэрн» забеспечылі 95-проц. яўку на справаздачны сход, **а рабочыя хлебазавода ўсе як адзін з'явіліся на сход.**

21 лістапада 982 выбаршчыкі чырвонасняжнага завода «Пролетарый» слухалі справаздачны даклад горсовета. Яны сустрэлі справаздачу **выкананнем гадавога промфінплана на паўтара месяца раней тэрміну.**

Па дакладу старшыні горсовета тав. **МАЛАШОНКА** былі вельмі ажыўленыя спрэчкі. Тав. Зярнікі ад групы малодых рабочых, якія першы раз прымаюць удзел у выбарах советаў, выставіў свае патрабаванні. Моладзь культурна расце. Каб забяспечыць яе далейшы культурны рост, патрабны ў Гомелі бібліятэкі па прыкладу Менска, добры тэатр, кіно, культурныя інтэрваты, басейны пры лазнях для плавання, якіх гамельчане яшчэ не маюць.

Старыя рабочыя гаварылі аб паляпшэнні культурна-бытавых умоў рабочых. Тав. **Залатухін** скарджыцца, што горсовет аддае мала ўвагі рабочаму пасёлку. Электрастанцыя часта працуе з перабоямі.

Дырэктар завода тав. **Фішбейн** адзначае неадпавальняючае кіраўніцтва горсовета прамысловасцю Гомеля. Залазычанасць гомельскай прамысловасці ў 13 мільёнаў рублёў за 9 месяцаў — рэзультат слабай работы горсовета.

Д. М.

Т. т. ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧ, ЧАРВЯКОЎ— ЧЛЕНЫ ГОРСОВЕТА

ВІЦЕБСК, 22. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

20 і 21 лістапада адбыліся выбарчыя сходы горсовета на заводзе «Чырвоны металіст», акулярнай фабрыцы і радзе іншых прадпрыемстваў. На заводзе «Чырвоны металіст» і акулярнай фабрыцы была забяспечана поўная яўка выбаршчыкаў. У склад горсовета рабочы калектыў завода «Чырвоны металіст» выбраў старых кадравікоў завода тт. **Ціхоша, Левінтова, Ефімава,** дырэктара завода **Слёзберга,** тэхніка **Гурэвіча,** камсамольца-зотаўца **Сямёнава** і інш. Адпагаласна, пад бурныя апладысменты ўсіх выбаршчыкаў, у склад горсовета былі выбраны тт. **Гікало** і **Валковіч.**

На акулярнай фабрыцы адпагаласна ў склад горсовета выбран т. **Чарвякоў.** З ліку выбраных дэпутатаў ад рабочых акулярнай фабрыкі ўзабліва трэба адзначыць ком самолку тав. **Жолківу,** лепшага брыгадыра фабрыкі.

На «Чырвоным металісце» і акулярнай рабочыя ўнеслі ў новы наказ горсовету рад канкрэтных прапаноў па паляпшэнню матэрыяльнага і культурнага абслугоўвання працоўных Віцебшчыны, далейшай пастаховай барацьбе за промфінплан.

З вялікай актыўнасцю, пры добрай яўцы, прайшлі справаздачныя сходы на панчошна-трыкатажнай фабрыцы імя Клары Цэткін і рабочых і служачых віцебскага трамвая.

У рэзультаце выключна дрэннай падрыхтоўкі сарваўся справаздачны сход на малаказаводзе, прызначаны на 21 лістапада, (усяго на сход з'явілася 50 проц. выбаршчыкаў і з 40 утрымальцаў—жонак рабочых — толькі 2).

У РУЖОВЫХ ФАРБАХ

СЛУЦАК. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Зала дома соцкультуры была далёка няпоўнай. На справаздачны сход слуцкага горсовета ад інтэрнацыянальнага калгаса «1 май» з'явілася толькі 62 проц. выбаршчыкаў.

Цяжка было ў гэты вечар выбаршчыкам інтэрнацыянальнага калгаса прабрацца ў клуб на сход. Нікомольны быў вартаўнік. Парадныя дзверы зачыны. Каб трапіць у клуб, трэба было прайсці праз цэлы лабірынт цёмных калідораў.

2 гадзіны выбаршчыкі чакалі пачатку сходу. І, нарэшце, на сцэне пакажуцца старшыня т. Кабакоў.

Больш паўтары гадзіны даклад Кабакоў. Шмат аб чым гаварыў ён: і аб тым, што пладзіцца завод выканаў промфінплан на 88 проц., сельгасмайстэрні — на 72 проц., што комунальная секцыя працуе добра, што на добрабыту горада зроблена вельмі многае, што ад санітарнай секцыі лепшай работы і чакаць не трэба.

Даклад закончан. Пачаліся спрэчкі. У сваіх выступленнях калгаснікі **Борд, Вайнер** і інш. указалі шмат таго, што было упушчана дакладчыкам.

З 1932 года ўжо будуецца двухпавярховы жылы дом, а кімчаць яго яшчэ не збіраюцца. Вельмі цяжка з-за цэмры ночу прабрацца па вуліцах Слуцка. На базары, дзе прадаецца мяса, фрукты — бруд, антысанітарыя. Калгасны клуб занят пад склад Заготзарна. Для таго, каб памыцца ў лазні, трэба ўстаць у 6 гадзін раніцы.

Калгаснікі «1 мая» сёлета багата атрымалі па працадзень: 3 кгр. вернавых, 10 кгр. бульбы, 3 руб. грашыма. Яны ўпарта змагаюцца за большэвіцкі калгас, за замоцнае жыццё. Яны хочуць культурна правесці вольны час. Яны патрабуюць выканання свайго наказу.

Аб выкананні наказу трэба было дакладваць выбаршчыкам.

В. АНЭТ.

ЯК ІДУЦЬ ВЫБАРЫ Ў СЕЛЬСКІЯ СОВЕТЫ

ПА РСФСР, Украіне, Беларусі, Закаўказзю і часткова Туркменіі на 28 лістапада выбрана 9.744 сельскіх советы — 15,5 проц. з агульнага ліку 62.824 сельсоветаў СССР.

У выбарах удзельнічала 6 млн. 530 тыс. чалавек, з іх 3.362 тыс. жанчыны. Яўка на выбары складае 80,8 проц. выбаршчыкаў супроць 70,4 проц. у 1930-31 г. Яўка жанчын склала 77,3 проц. супроць 63,4 проц. у 1930-1931 г.

Усяго выбрана 208.232 дэпутаты, у тым ліку 50.535 жанчын — 24,3 проц. супроць 21 проц. у 1930-1931 г.

Па Саюзу і Совецкай Беларусі

СЯТКАВАННЕ 15-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ КУРСКА АД БЕЛЫХ БАНД

КУРСК, 22 лістапада. (БЕЛТА). Учора адбылося ўрачыстае пасяджэнне партыйных, совецкіх і профсаюзных арганізацый Курска, прысвечанае 15-годдзю вызвалення Курска ад белых банд Дзянікіна. Бурнай авацыяй была спаткана прапанова выбраць ганаровай старшынёй сходу непасрэднага кіраўніка і арганізатара перамогі над Дзянікіным—т. **Сталіна.**

Сходам пасланы прывітальныя тэлеграмы тт. **Сталіну, Молатаву, Кагановічу, Варашылаву, Орджанікідзе і Будзённаму.**

Горсовет узнагародзіў старых партызан і чырвонагвардзейцаў ганаровымі граматамі, імяннымі гадзіннікамі і зброяй. Раду партызан прысвоены пажыццёвыя персанальныя пенсіі. Для дзяцей партызан у вузах Курска выдзелены стыпендыі ў 300 і 500 руб.

ГІСТОРЫЯ РУСКАЙ БАСТЫЛІІ

ЛЕНІНГРАД, 22 лістапада. (БЕЛТА). Музей Рэвалюцыі наладжвае ў Петрапаўлаўскай крэпасці выстаўку, якая характарызуе гісторыю рускай Бастыліі за 231 год яе існавання. Для выстаўкі адведзена рад памяшканняў у Трубецкім бастыёне.

10 ТЫСЯЧ ТРАКТАРАЎ

ЧЭЛЯБІНСК, 22 лістапада. (БЕЛТА). Раніцой з канвеера трактарнага завода выйшоў дзесяцітысячны трактар. Рабочыя завода абавязаліся сустрэць VII з'езд советаў датэрміновым выкананнем гадавога плана.

ЗАБІТА 440.800 ГАЛОЎ МОРСКАГА ЗВЕРА

МАСКВА, 22 лістапада. (БЕЛТА). У асноўным закончан промысел морскага звера. Здабыча морскага звера ў гэтым годзе рэкордная. За 10 месяцаў забіта 440.800 галоў розднага морскага звера. План выканан на 108,8 проц. Усё шырэй прымяняецца авіяразведка на промыслах.

„СИБИРЯКОВ" ВЯРНУЎСЯ З АРКТЫЧНАГА РЭЙСУ

АРХАНГЕЛЬСК, 22 лістапада. (БЕЛТА). Сёння з 30-дзённага арктычнага рэйсу вярнуўся чырвонасняжны ледакол «Сибиряков». У найтруднейшых умовах пачаўшаяся палярная ночы, пры вялікіх марозах «Сибиряков» даставіў груз у бухту Варнека, наведаў станцыю Матачкін Шар і пасля гэтага арабіў тры рэйсы з бухты Варнека на флюарытавы рудник Амдэрму. Рудник забяспечан усім неабходным для бесперабойнага выканання плана.

РЫХТУЮЦЦА ДА ЗІМОВАГА СПОРТСЕЗОНА

СПІНО. У раёне пачалася падрыхтоўка да зімовага спартыўнага сезона. Сёлета ў калгасах арганізаваны 33 лыжных станцыі. У горадзе будзе пабудован каток і лыжная станцыя на 100 пар лыж. Для лыжных станцый ужо завезена 100 пар лыж. Арганізуюцца курсы работнікаў фізкультуры па зімовых відах спорту.

РАСЦЕ СЕТКА УЗОРНЫХ МАГАЗІНАЎ

БАРЫСАЎ, 22. Райспажыўсаюз пачынае ў абсталяванне новага раённага універсальнага магазіна. На гэту справу адпушчана 45.000 рублёў. У магазіне будзе сем аддзелаў.

СЕЛЬСКАЯ АЛІМПІЯДА САМАДЗЕЙНАГА МАСТАЦТВА

ЖЛОБІН, 20. 17 лістапада ў Лукаўскім сельсавеце адбылася канферэнцыя моладзі, скліканая палітаддзелам МТС і райкомам комсамола па пытанню выяўлення лепшых сіл самадзейнага мастацтва.

У клуб сабралася больш 300 чалавек. Выступілі 8 гарманістаў, 3 скрыпачы і 10 танцораў. Асаблівай увагі заслугоўвае выступленне жанчыны-калгаснікі брыгадзіра з калгаса «Чырвоная рошча» **Старастагай.** Яна выканала свой уласны твор—спеў «Залатое жыта».

Канферэнцыя звярнулася да палітаддзела і РК ЛКСМ з патрабаваннем скліканьня раённую алімпіяду самадзейнага мастацтва. Абвешчана раённы конкурс на лепшага гарманіста, скрыпача і танцора.

МТФ калгаса «Першая кошпа», Менскага раёна. Даярка адае малако.

МОЛАКАЎ, БАБУШКІН І КРЭНКЕЛЬ У ОРШЫ

ОРША, 23-XI. (БЕЛТА). Герой Совецкага Саюза тав. **Молакаў** і чэлюскінцы тт. **Бабушкін і Крэнкель** 23 лістапада прыбылі ў Оршу. Яны наведалі мясакамбінат, ТАРДРЭС, клуб чыгуначнікаў і клуб будаўнікоў. Бурлівае чэлюскінскае ў клубах выклікала сярод рабочых і працоўных горада бурны энтузіязм.

Чэлюскінцы расказалі рабочым як пад большэвіцкім кіраўніцтвам яны змагаліся і перамаглі ў суровых умовах Арктыкі.

На прыезд чэлюскінцаў рабочыя адказваюць барацьбой за тэхніку, за выкананне промфінплана.

Па даручэнню рабочых мясакамбіната тав. Васілеўскі заявіў, што асобныя цэхі прысвойваюць сабе імя Молакава, Крэнкеля Бабушкіна.

ПАКОНЧЫЦЬ З ГАНЕБНЫМ ТАПТАННЕМ НА МЕСЦЫ!

У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ЗАВЯРШЫЦЬ ІЛЬНОЗАГАТОУКІ І ХЛЕБАЗАКУПКІ

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

Камісія адзначае, што мінулая пяцідзёўка лістапада не дала ніякага зруху ні ў ільнозагатоўках, ні ў хлебазакупках. Рад раёнаў, такія як Гарадоцкі, Горацкі, Мсціслаўскі, Клімавіцкі, дапі за гэту пяцідзёўку ўсяго толькі ад 2 да 3,5 проц. прыросту па ільну.

Сцяг ЦК і СНК камісія перадае за МЕНСКІМ раёнам, які паспяхова завяршыў хлебазакупкі. Але камісія зноў папярэджвае кіраўніцтва раёна аб тым, што тэмпы мясапаставак па-ранейшаму прадаўжаюць быць недастатковымі.

Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць АРШАНСКІ (таксама скончыўшы хлебазакупкі), АСІПАВІЦКІ, ВІЦЕБСКІ раёны, а таксама з папярэджаннем аб неабходнасці ліквідаваць адставанне: КАСЦЮКОВІЦКІ —у мясапастаўках і здачы пянькі, ПРАПОЙСКІ, ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ—у мясапастаўках.

Дадаткова запічыць кандыдатам на атрыманне сцяга, скончыўшы хлебазакупкі і ільнозагатоўкі, СТАРОБІНСКІ раён.

Сцяг ЦК і СНК па ільнавочай зоне пакінуць за СЕННЕНСКІМ раёнам, які за апошнюю пяцідзёнку дабіўся значнага зруху ў хлебазакупках. Папярэдзіць раён аб неабходнасці ўзмацніць тэмпы мясапаставак.

Адзначыць, што і ў гэтую пяцідзёўку ні адзін з ільнавочных раёнаў не можа быць занесен кандыдатам на атрыманне сцяга.

Сцяг палітсектара МТС НКЗБ пакінуць у АРШАНСКАЙ МТС. Кандыдатамі на атрыманне сцяга пічыць КАСЦЮКОВІЦКУЮ і ТАНЕЖЫЦКУЮ МТС.

За ганебнае адставанне ў выкананні планаў ільнозагатовак, мясапаставак і адставанне ў хлебазакупках камісія пакідае на чорнай дошцы МАГІЛЕЎСКІ, КАРМЯНСКІ, МСЦІСЛАЎСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, ЧАВУСКІ, ПЕТРЫКОЎСКІ і РАГАЧОЎСКІ раёны.

Зняць з чорнай дошкі ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ і НАРАЎЛЯНСКІ раёны, якія дабіліся пералома ў хлебазакупках, адначасова адзначыць ганебнае адставанне гэтых раёнаў у ільнозагатоўках. Адзначыць, што Петрыкоўскі, Рогачоўскі раёны толькі тады могуць быць зняты з чорнай дошкі, калі першыя 2 ліквідуюць ганебнае адставанне ў хлебазакупках, а апошні — у ільнозагатоўках. Дадаткова за абсалютна нездавальняючыя тэмпы ільнозагатовак і хлебазакупак занесці на чорную дошку БРАГІНСКІ і ХОЙНІЦКІ раёны.

Кандыдатамі на чорную дошку пакінуць БЫХАЎСКІ, РЭЧЫЦКІ і ЧЭРВЕНЬСКІ раёны. Зняць з кандыдатаў на чорную дошку ЕЛЬСКІ раён, але папярэдзіць кіраўніцтва раёна, што для таго, каб канчаткова вывесці раён з ліку адстаючых, патрэбна яшчэ больш узмацніць тэмпы ільнозагатовак.

Папярэдзіць кіраўніцтва ЧОРНАКАЎСКАГА, МАЗЫРСКАГА, БАРЫСАЎСКАГА, а таксама ў апошні раз КЛІМАВІЦКАГА і ГОРАЦКАГА раёнаў аб тым, што калі гэтыя раёны ў бліжэйшую пяцідзёўку не дабіўцца зруху ў ільнозагатоўках, мясапастаўках і хлебазакупках, яны будуць запічаны кандыдатамі на чорную дошку.

СПАБОРНІЦТВА РЭСПУБЛІК І АБЛАСЦЕЙ УФАТАЗРЫНГОВАЕ ЗАЕСГРШЭННЕ ІЛЬНОЗАГАТОВАК

на 20 лістапада

Гарадоўская вобласць	90,0
БССР	82,2
Іванаўская вобласць	77,5
Ленінградская	70,9
Заходняя	65,5
Горкаўскі край	57,8

Чорная дошка

За зрыў выканання планаў перапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі і іншых паставак дзяржаве заносяцца на чорную дошку:

МАГІЛЕЎСКІ раён (сакратар РК Равінскі, старшыня РВК Пушчын);

КАРМЯНСКІ раён (сакратар РК Саладухін, старшыня РВК Грыбзедаў);

РАГАЧОЎСКІ раён (сакратар РК Геўрасёў, старшыня РВК Зялёнка);

ЛЕЛЬЧЫЦКІ раён (сакратар РК Асінскі, старшыня РВК Гаўрусёў);

ПЕТРЫКОЎСКІ раён (сакратар РК Арашчук, старшыня РВК Град).

МСЦІСЛАЎСКІ раён (сакратар РК Штэйнгарт, старшыня РВК Рай);

ЧАВУСКІ раён (сакратар РК Кулікоў),

БРАГІНСКІ раён (сакратар РК Кажар, старшыня РВК Хілімонча).

ХОЙНІЦКІ раён (сакратар РК Марціновіч, старшыня РВК Марчанка).

Перадавыя калгасы БССР!

Падхапіце заклік перадавых шклоўскіх калгасаў. Арганізуйце здачу ільновалакна звыш плана!

ШКЛОЎ, 22. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Мы, група старшынь калгасаў зоны Шклоўскай МТС, датэрмінова выканаўшы гадавы план ільнозагатовак, зразумеўшы ўсю важнасць перавыканання плана па ільну, у парадку падрыхтоўкі і падарунка VII раённаму з'езду сов. таў бярэм на сябе абавязацельства — на працягу двух дзён даць звыш плана наступную колькасць ільнопрадукцыі:

Калгасы Стара-Вадзянскага сельсовета: «Совецкая Беларусь» — 10 цэнтн. ільновалакна, імя Варашылава — 10 цэнтн., «Новае жыццё» — 4 цэнтн., «Зара» — 20 цэнтн., «Перамога» — 9 цэнтн., «Шлях пролетарыята» — 4 цэнтн.

Калгас імя Леніна, Рыжкаўскага сельсовета — 9 цэнтн. трасты, «Чырвоны окцябр», Чарнаруцкага сельсовета — 4 цэнтн. валакна, імя Буйёнага, Талкачоўскага сельсовета — 5 цэнтн. валакна, «Новы шлях», Александрынскага сельсовета — 5 цэнтн. валакна, «Энергія» тэтага-ж сельсовета — 5 цэнтн. валакна; імя Карла Маркса Чарнянскага сельсовета — 20 цэнтн. трасты, імя Молатава, таго-ж сельсовета — 4 ц. трасты, «Калектыўная праца», Чарнаруцкага сельсовета — 2 цэнтн. валакна і 15 цэнтн. трасты.

Мы памятаем, што за здачы звыш плана лён нашы калгасы атрымаюць ад дзяржавы на 50 проц. больш хлеба, промтавараў, грошай і т. д., што дасць нам магчымасць яшчэ больш гаспадарча ўмацаваць калгасы, палепшыць матэрыяльнае становішча калгаснікаў.

Выклікаем паследаць нашаму прыкладу і здаць лішні ільнопрадукцыі дзяржаве ўсе калгасы і працоўныя аднаасобнікаў нашага раёна і ўсёй БССР.

Старшыні калгасаў: Мікалаеў, Дамарацкі, Корба, Ігнатаў, Пафонаў, Філіпаў, Алядзеў, Карабёў, Шляпакоў, Зайцаў, Рудберг, Кірылейка, Качанаў, Кінчэнка.

УЛІЧЫЦЬ УРОКІ ЧАВУСКАЙ СПРАВЫ

Свінаферма калгаса «Серп і молат» злічылася ў Чавускім раёне ўзорнай. На дошцы гонару лепшых ударнікаў жывёлагадоўлі, прысвечанай дню ўраджаю, красуецца фота-здымак загадчыцы гэтай фермы тав. Марты Цесгрукоўскай. Кіраўнікі раёна прыводзяць гэту ферму, як прыклад сапраўднага пералому ў справе жывёлагадоўлі.

— Была гэта ферма ўсе мінулыя гады прарыўной — гаворыць сакратар райкома тав. Кулікаў. — Адыход парасят даходзіў да 50 проц., а зараз...

Зараз на гэтай ферме на вестках райзямаддзела адыход складае ўсяго 8-9 проц. Адным словам ферма з адстаючых выйшла ў рады перадавых.

Як узорную ферму па захаванню маладняка буйнай рагатай жывёлы, у раёне прыводзяць ферму калгаса «Заветы Ільіча». Па гэтых-жа вестках райза з 67 цялят зацёлу 1934 года загінула ўсяго тры.

Паўтараем: гэта па вестках райзямаддзела. Але гэтыя весткі настолькі далёкі ад сапраўднага становішча ферм, як далёкі кіраўнікі Чавускага раёна ад кіраўніцтва жывёлагадоўляй.

Аказваецца, што на гэтых «узорных» фермах адыход маладняка па ферме калгаса «Серп і молат» складае не 8-9 проц., а 43, а па ферме калгаса «Заветы Ільіча» знішчан амаль увесь прыплод 1934 года; такіх прыкладаў можна прывесці дзесяткі. Кіраўнікі гэтых калгасаў у сваіх справаздачах утойвалі гэты адыход, а райза на аснове гэтых жульніцкіх справаздач занёс гэтыя фермы ў лік узорных.

Прыклад гэтых ферм паказвае, як у Чавускім раёне кіравалі асноўным звяном у справе ўздыму жывёлагадоўлі—калгаснымі фермамі.

Канцэлярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва прывялі да таго, што па працягу чатырох месяцаў ад ліпеня да лістапада пагалоўе буйнай рагатай жывёлы ў аграмаджаным сектары зменшылася на 7,4 проц. і 25 проц. на авечках. План камплектавання калгасных жывёлагадоўчых ферм па каровах, свіннях і авечках сарваны.

Старшыня чавускага райвыканкома тав. Буры імкнуўся давесці, што знікненне паталоўя ідзе за лік выканання плана мясапаставак. Гэта па сутнасці кулацкая «тэорыя» процістаўлення разгортвання жывёлагадоўлі мясапастаўкам абвяргаецца лічбамі самога-ж райвыканкома. Расход стада па буйнай рагатай жывёле на фермах калгаса раёна складае па вестках райза (безумоўна перааўмешаных) 1.101 галаву. Дзяржаве-ж здана 450. Прадана, зарэзана і загінула 751 галава. Па свіньях з расходу 1.555 галоў дзяржаве здана ўсяго 279, астатнія разбазараны. Па авечках з расходу 560 галоў здана дзяржаве толькі 138.

Такім чынам, нават на гэтых яўна перааўмешаных даных, расход стада ідзе ў асноўным за лік пакідзяку, продажы і ўбою. Здача-ж дзяржаве займае меншы адной трэці змяншэння ўсяго стада.

Гэтыя кулацкія ўстаноўкі былі падхопілы Буруму для таго, каб апраўдаць сваю дзейнасць па пагаршэнню разбазаравання жывёлы. У той час, калі ў раёне пачалося масавае разбазаравание жывёлы, калі кулацкія элементы беспакарана знішчаюць калгаснае стада. Буры дае дырэктыву аб узмацненні выбарачкі жывёлы. На працягу больш месяца ўсе зоаветработнікі раёна былі заняты выбарачкоўкай жывёлы на калгасных фермах для дэцэнтралізаваных загатовак, у той час, калі фермы па раёну і ў прыватнасці, на гэтых калгасах, не ўкамплектаваны.

Кармовыя балансы па вестках райза складзены ў 98 калгасах з 207, якія маюць аграмаджаную жывёлагадоўлю. Якасць складзеных балансаў вельмі нізкая. У значнай частцы іх не ўлічан прыплод 1935 года. Кармы перададзены фермам толькі па 43 калгасах і то толькі фарміальна. Такім чынам, нахто ў раёне не ведае сапраўднага становішча кармовых балансаў. У гэты-ж самы час пачалося ўжо разбазаравание кармоў. У калгасе «Юны комунар» у станках валяецца вялікая колькасць канюшыны. Загадчык фермы ўпэўнен, што канюшыны хопіць. У гэты-ж самы час у калгасе яшчэ нават не складзен кармовы баланс.

З захаваных 7.000 цялят ацёлу 1934 года больш 4.000 знаходзяцца ў неагрымаджаным сектары.

За апошнія два месяцы па Чавускаму раёну пачаўся масавы прыплыў у калгасы. Кулацкія варожыя элементы накіравалі ўсю сваю ўвагу на тое, каб падбухторваць пова-ўступіўшых калгаснікаў на разбазаравание жывёлы. У раёне началося масавае разбазаравание жывёлы. Мы ўжо ў свой час пісалі аб тым, як рэагавала кіраўніцтва Чавускага раёна на тэлеграму ЦК КП(б)Б з прапановай аб неадкладным спынені разбазаравання жывёлы. Гэта тэлеграма была фактычна ўтоена ад партыйнай арганізацыі.

Нават пасля таго, як у «Звязде» быў апублікаван матэрыял аб разбазаравані жывёлы па Чавускому раёну, пасля прыезду камісіі ЦК, кіраўнік раёна ўсё яшчэ імкнуўся даказаць, што масавага разбазаравання жывёлы ў раёне няма, што ўсе пяляты зацёлу 1934 года, якія паказаны ў пераліку за лістапад, поўнасцю захаваны. Між тым выбарачная праверка ў 4 пунктах раёна паказвае, што за перыяд з 1 ліпеня па 15 кастрычніка паталоўе буйнай рагатай жывёлы і авечак знізілася больш чым на палову. Толькі прытуленнем рэвалюцыйнай пільнасці можна тлумачыць той факт, што кіраўніцтва раёна да апошніх дзён не заўважвала шкодніцкай дзейнасці кулацкіх элементаў.

Рашэнне ЦК па Чавускаму раёну павінна паслужыць урокам для ўсіх партыйных арганізацый. Партыя патрабуе, каб не на словах, а на справе РК і РВК займаліся барацьбой за маладняк, за цёплую і сытую зімоўку для жывёлы. Толькі ў гэтым гарантыя таго, што мы забяспечым належны пералом у жывёлагадоўлі так, як патрабуе ад нас партыя, так, як паставіў пытанне таварыш Сталін.

ГРЫНГЛАЗ.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Пастановай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносяцца на чырвоную дошку:

МЕНСКІ раён (сакратар ГК Рыскін, старшыня РВК Турэцкі);

АРШАНСКІ раён (сакратар РК Соскін, старшыня РВК Міцькоў);

СЕННЕНСКІ раён (сакратар РК Кац, старшыня РВК Качук);

СТАРОБІНСКІ раён (сакратар РК Баярчапка, старшыня РВК Махнач).

АСІПАВІЦКІ раён (сакратар РК Фельдман, старшыня РВК Караленка);

ВІЦЕБСКІ раён (сакратар ГК Жураўлёў, старшыня горсовета Авегын);

КАСЦЮКОВІЦКІ раён (сакратар РК Лісковіч, старшыня РВК Грэбеньчык);

ЧЫРВОНА-СЛАБОДСКІ раён (сакратар РК Бурдзілаў, старшыня РВК Цьганкоў);

ПРАПОЙСКІ раён (сакратар РК Кавалёў, старшыня РВК Чорнабродаў).

ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛАН ІЛЬНОЗАГАТОВАК

ЖЛОБІН (Па тэлеграфу).

На 20 лістапада калгасы ЖЛОБІНСКАЙ МТС план здачы ільновалакна выканалі на 102,5 проц. Змагаемся за перавыкананне калгасамі плана па ільновалакну.

Дырэктар МТС ЖУРОК. Нам. нач. палітаддзела ШЫРОКІ.

***

Зона ГОМЕЛЬСКАЙ МАШЫННА ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ план здачы ільновалакна да 20 лістапада выканала на 104 проц.

Дабіваемся перавыкананння плана, выканання яго кожным калгасам.

Дырэктар МТС ВАЛЮКЕВІЧ,
Начальнік палітаддзела ВАЛОШЫНАЎ.

ХОД ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ, ПЯНЬКІ, МЯСАПАСТАВАК І ЗАСЫПКІ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ ПА БССР

на 20 лістапада 1934 г.

РАЁНЫ	Загатоўкі ільну	Загатоўкі пяньки	Трэсты	Загатоўкі пяньки	Выканн. плана мясапаставак	Зерновых	Засыпка насення Бульбы
1. Асіпавіцкі	110,2	110,2	—	80,0	86,4	70,7	140,3
2. Менскі	106,2	106,2	—	106,7	81,9	56,1	121,6
3. Аршанскі	100,0	101,1	96,0	69,1	77,8	91,1	107,5
4. Старобінскі	100,0	100,0	—	24,7	91,3	64,2	105,5
5. Чырвона-Слабодскі	102,6	102,6	—	94,4	79,9	68,4	144,0
6. Сенненскі	102,4	105,0	100,3	14,9	82,7	40,3	99,9
7. Касцюковіцкі	101,9	101,8	102,0	27,5	71,0	57,3	48,4
8. Віцебскі	100,6	100,6	—	—	84,2	55,6	96,6
9. Прапойскі	100,3	100,3	—	17,1	79,0	63,3	93,1
10. Смаляві́цкі	100,1	100,1	—	100,5	83,4	42,9	102,7
11. Клічаўскі	98,2	98,2	—	93,0	69,4	57,1	167,9
12. Дрысенскі	97,8	86,5	98,5	—	91,3	53,2	95,4
13. Камарынскі	96,9	96,9	—	112,3	90,9	12,6	25,3
14. Любаншскі	96,7	96,7	—	44,9	93,9	75,3	106,1
15. Полацкі	96,4	92,7	99,3	37,8	81,2	58,4	89,8
16. Чашніцкі	95,8	94,0	97,8	20,0	75,5	35,6	100,0
17. Сенненскі	95,1	95,1	—	53,3	86,6	72,3	114,4
18. Уладзенскі	94,6	94,6	—	73,0	87,8	60,2	109,9
19. Асвейскі	94,0	84,2	97,6	—	86,4	55,0	130,0
20. Бягомльскі	92,7	92,7	—	83,1	78,7	87,7	108,2
21. Бешанковіцкі	92,3	96,3	89,6	57,6	78,2	71,4	99,0
22. Сяроціскі	91,2	170,9	75,8	30,9	81,6	67,9	108,0
23. Ст.-Дарожскі	90,7	90,7	—	32,7	87,9	64,1	90,6
24. Капыльскі	90,2	90,2	—	29,0	82,4	46,2	101,2
25. Плешчаніцкі	88,5	88,5	—	75,6	68,8	38,0	—
26. Бялыніцкі	88,4	88,4	—	34,0	78,0	104,0	122,9
27. Суражскі	88,1	128,2	72,2	2,3	89,0	76,2	102,7
28. Ветка́ўскі	87,6	87,6	—	26,0	69,3	68,2	103,2
29. Лепельскі	87,4	86,8	87,6	12,7	76,5	42,9	91,9
30. Дзяржынскі	86,9	86,9	—	28,3	78,6	44,2	113,3
31. Лёзненскі	86,3	76,2	92,2	10,7	80,6	43,0	80,3
32. Заслаўскі	85,5	85,5	—	27,0	80,8	29,7	110,1
33. Талачынскі	85,0	90,1	80,4	20,3	73,5	45,9	75,1
34. Буда-Кашалёўскі	84,1	84,1	—	38,1	87,8	92,3	124,9
35. Глускі	84,1	84,1	—	69,0	78,0	76,8	114,6
36. Крычаўскі	83,7	82,3	84,6	15,5	78,0	44,6	112,3
37. Шклоўскі	83,4	81,8	85,3	16,2	80,9	27,0	56,0
38. Бярэзінскі	83,2	83,2	—	79,3	79,3	67,0	104,1
39. Жыткавіцкі	82,5	82,5	—	65,7	87,6	79,7	81,2
40. Ушацкі	82,0	65,1	101,0	34,0	80,6	44,5	118,4
41. Уваравіцкі	81,8	92,4	71,9	20,0	89,6	29,9	43,8
42. Крупскі	81,5	77,5	84,6	70,0	73,1	78,4	108,6
43. Лоеўскі	81,3	81,3	—	89,0	84,3	77,2	112,6
44. Церахаўскі	80,9	91,3	66,3	100,1	76,5	82,5	66,6
45. Гомельскі	80,1	80,1	—	14,0	75,2	75,3	111,1
46. Чачэрскі	80,1	80,1	—	29,0	83,9	50,7	11[illegible]
47. Тураўскі	80,0	80,0	—	96,0	86,3	88,6	13[illegible]
48. Жлобінскі	79,7	79,7	—	49,6	78,5	71,8	99,1
49. Бабруйскі	79,6	52,5	115,5	40,3	86,2	44,5	81,1
50. Пухавіцкі	79,4	62,2	102,2	32,9	78,5	61,5	91,1
51. Расонскі	78,9	84,4	78,1	80,0	90,3	57,9	74,3
52. Лагойскі	77,5	77,5	—	74,0	77,9	45,3	144,4
53. Парыцкі	77,0	77,0	—	55,7	87,4	56,6	87,7
54. Гарадоцкі	76,4	68,7	85,3	35,0	79,4	85,3	108,7
55. Чэрвеньскі	75,7	75,7	—	117,0	70,0	91,4	129,3
56. Барысаўскі	75,2	75,2	—	102,2	74,2	89,4	114,4
57. Мазырскі	75,1	75,1	—	82,7	82,0	84,8	102,3
58. Чэрыкаўскі	75,1	75,1	—	42,0	82,3	43,0	108,2
59. Ельскі	73,4	73,4	—	72,4	85,6	26,1	33,9
60. Рагачоўскі	72,2	74,0	69,6	60,0	79,7	76,6	100,4
61. Петрыкоўскі	71,0	71,0	—	73,9	82,0	82,4	101,0
62. Горацкі	68,9	73,6	59,2	11,5	87,5	56,2	93,9
63. Быхаўскі	68,1	68,1	—	49,7	82,6	61,3	95,6
64. Рэчыцкі	68,0	68,0	—	79,6	81,4	45,7	61,8
65. Клімавіцкі	67,9	67,9	—	17,6	76,6	59,1	93,3
66. Чавускі	67,4	77,6	56,4	48,4	77,3	61,5	134,5
67. Лельчыцкі	67,4	67,4	—	91,2	76,9	73,1	127,3
68. Магілеўскі	66,7	69,7	62,0	14,4	68,4	60,5	87,2
69. Брагінскі	66,3	66,3	—	62,0	87,0	32,6	63,3
70. Хойніцкі	66,3	66,3	—	42,6	81,0	91,8	107,5
71. Нараўлянскі	63,1	63,1	—	77,2	84,7	45,4	59,2
72. Мсціслаўскі	61,1	43,6	78,1	9,4	72,7	31,4	10[illegible]
73. Чырвонапольскі	60,3	32,8	87,9	12,0	68,9	59,9	84,[illegible]
74. Кармянскі	60,2	57,8	63,6	25,0	80,0	11,2	—
75. Дуброўенскі	46,3	46,2		2,0	75,1	70,1	131,7
РАЗАМ ПА БССР	82,2	80,2	85,0	46,2	79,8	57,9	93,5

ЗМЯСТОЎНАЕ ЖЫЦЦЕ

СЯРГЕЙ РАКІТА

— Вы пытаецеся, за што мяне увесь час выбіраюць у совет. Праўда я, вядома, вам не магу сказаць. Пра гэта хай скажуць другія.

Пахом Сцяпанавіч скромна апускае вочы і змяўкае. Ён, зразумела, ведае, за што яго 17 год выбіраюць членам Бабініцкага сельсовета. Адзнак, ці-ж яму хваліцца, ці-ж яму расхвальваць сябе?

Пахом Сцяпанавіч наогул надзвычай скромны чалавек. Ён скупы на рухі, скупы на словы, але багаты на справы. І гэта скромнасць так пасуе да яго высокай статнай фігуры, акуратнай і, не гледзячы на 74-галовы ўзрост, здаровай і энергічнай.

...Мы сядзім за сталом у хаце Пахома Сцяпанавіча. Вечарэе. З вакон відаць вялікі масіў маладога лесу. Ён цягнецца ў далеч, на захад. Там лес пераходзіць у густы хмызняк. Відаць: шэра хмызняк бяжыць звілістая вузкая рэчка. Гэта — граніца паміж двума светамі, паміж Совецкай Беларуссю і капіталістычнай Польшчай.

І неяк дзіўна робіцца, калі глядзіш на лес, укрыты пажоўклымі лістямі: ён аднолькавы і па нашым і на тым баку: няўжо гэта не адзін прастор. А выходзіць: там другое жыццё, другія парадкі, другія справы.

Пахом Сцяпанавіч павольна разгладжвае сваю сівую акладзістую бараду. Ён думае над нашымі запытаннямі. Ён прыпамінае свае ранейшае жыццё.

— Ну, што вам сказаць пра былое. Былое было, былое — сіла ло. Жыў я бедна колісь. Зямлі надзел карова, конь ды восем галодных ратоў — усё багацце маё.

Пахом Сцяпанавіч міжвольна ўздыхае. Відаць, з вялікай неахвотай, з непрыемнасцю ўспамінае ён сваё мінулае.

— У маладосці, калі на жыццё глядзяць з радаснымі надзеямі, і я думаў, а мо' і вылезу з прадвечнай нястачы. Прыдбаю як-небудзь капейку: зямліцы прыкупаю, абжывуся. Хацелася жыць у дастатку. Але не выходзіла. Дзе тая капейка?

Зямля ў пана Клёта — чатыры вакольных маёнткі — зямля ў кулакоў Пяткевіча Вікенція, Царка Станіслава ды іншых — па пяць надзелаў у кожнага.

А ў мяне што? У засеку не густа, на стале пуста, лапці лазовыя ды аборы пяньковыя — як гаворыць ця ў прыказцы.

Пахом Сцяпанавіч задумена маўчыць. І раптам ён балёра падымае вочы. Твар яго адразу прасвятліўся і ён натхнёна гаворыць:

— З 17 года пачаў я жыць. От калі пачалося маё жыццё.

...Восенню, калі, як і сёння, аблятела пажоўклае лісце з дрэў, калі пад нагамі хрустаў тонкі лядок на лужынах, — гэта было 17 год таму назад, — Пахом Сцяпанавіч прыбег з валаснай управы дадому ў вёску Пятрова расказаць аб вялікай, нечуванай радасці.

— Рэвалюцыя ў Расіі. Большэвікі ўладу ўзялі ў свае рукі, — паведаміў Пахом Сцяпанавіч аднавяскоўцам. Ён яшчэ не разумеў добра, што гэта значае, але адчуваў нутром, што тое, чаго чакаў ён усё жыццё, адбылося. І Пахом Сцяпанавіч не мог спакойна гаварыць ад урачыстага хвалявання.

На першым агульным сходзе аднавяскоўцаў, калі было пастаўлена пытанне аб выбарах ў совет, з натоўпу шматлікія галасы пагукнулі:

— Пахома Гарамыка.

— Старога хочам ставіць да ўлады.

Пахом Сцяпанавіч ніколі не адмаўляўся ад сваіх абавязкаў. Ён быў рад такому вялікаму даверю, ён быў шчаслівы такім ганаровым даручэннем.

У 1929 годзе Пахом Сцяпанавіч выбіраецца членам полацкага райвыканкома.

У гэты час вёска Пятрова — Пахомава вёска — не была яшчэ ў калгасе. Даўно думаў аб гэтым Пахом Сцяпанавіч і цяпер канчаткова пераважыў:

— Уся вёска павінна быць у калгасе.

Доўгі час хадзіў ён па суседскіх хатах. Расказваў усё далатнае, што ведаў пра калгаснае жыццё, раіў, угаварваў.

Урэшце, у 1930 годзе ўвесь пасёлак Пятрова ўлічыўся ў калгас «Прагрэс». Новая работа ў Пахома Сцяпанавіча. Ён — калгаснік. Ён — брыгадзір. Ён — член праўлення калгаса.

У кароткія перапынкі ў часе работы, пасля работы вечарамі ён выконвае сельсовецкія заданні. Цярпліва, настойліва працуе Пахом Сцяпанавіч сярод аднаасобнікаў. І не дзіва, што яго пункт заўсёды займае першае месца.

І цяпер пункт Пахома Сцяпанавіча першы на сельсовету. Усе гаспадаркі, якія абслугоўвае ён, поўнасцю выканалі ўсе абавязкі перад дзяржавай.

Пахом Сцяпанавіч — 74-гадовы стары — лепшы ўдарнік у калгасе. За восем месяцаў ён выпрацаваў 236 працадзён. Такую лічбу мае не кожны малады, у поўнай сіле калгаснік.

За выдатную работу райвыканком некалькі раз прэміраваў Пахома Сцяпанавіча: грашыма, вопраткай.

— Вось калі багацець пачынаю я, — гаворыць Пахом Сцяпанавіч. — Хлеба, які мне прылічваецца, хопіць нам з старою на год з лішкам. А зараз вось атрымаў я ў прэмію ад калгаса парасё. На сала карміць буду.

Цяпер разумее Пахом Сцяпанавіч, што адшукаў ён сваю дарогу ў жыцці. Разумее, што дарэмна шукаў яе калісці; занята была яна панам Клётам, Пяткевічамі ды Царкамі.

Аб адным шкадуе Пахом Сцяпанавіч.

— Эх, рана нарадзіўся я. Далібог, рана. Мне-б цяпер маладым быць. Столькі работы вакол і такая жывая ды цікавая ўся. Але нішто, як малады папрацую яшчэ я.

Ведаючы гэту маладую працавітую якасць Пахома Сцяпанавіча, аднавяскоўцы і ў гэтым годзе аднадушна галасавалі за яго кандыдатуру. Пахом Сцяпанавіч і сёлета выбран у сельсовет.

Нядаўна адбылося святкаванне 17-гадовага юбілея работы Пахома Сцяпанавіча ў органах советаў.

На ўрачыстым банкеце Пахом Сцяпанавіч адчуваў сябе, як ніколі ў жыцці, радасна і шчасліва.

Ён адчуваў, як ніколі выразна, усю розніцу паміж яго чорным мінулым і радасным сучасным.

У разгары банкета, калі ўсе напярэдадні віталі юбіляра, Пахом Сцяпанавіч узнёсся з-за стала і сказаў нечаканае:

— Гарамычнае маё жыццё было да рэвалюцыі таварышы і сябры. І прозвішча маё падобна на былое жыццё — Гарамыка. Ці-ж маю я права насіць гэтае прозвішча?

Усе ў адзін голас адказалі:

— Не маеш права, дзед Пахом, насіць гарамычнае прозвішча. Змяніць патрэбна.

— Я гэта зрабіць і наважыўся. І ад сённяшняга дня мяняю прозвішча Гарамыка на Радасцін. Нехай першая частка майго прозвішча Гарамыка — нагадвае мне аб бяздольным мінулым, каб яшчэ ўрачыстей гучэла другая частка — Радасцін—у адзнаку нашага радаснага жыцця.

Дошка гонару

«Рэальнасць нашай праграмы — гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасць працаваць па-новаму, наша рашучасць выканаць план». (СТАЛІН).

За датэрміновае выкананне промфінплана 1934 года, узорную пастаноўку вытворчасці і аўладанне тэхнікай «Звязда» заносіць на дошку гонару:

1. МЕНСКІ ЧЫРВОНАСЦЯЖНЫ МАШЫНА-БУДАЎНІЧЫ ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА.

Дырэктар завода тав. **Шолкаў**, сакратар парткома тав. **Дэйч**, старшыня заўкома тав. **Веркін**.

Завод выканаў гадавы план **17 лістапада**.

2. ВІЦЕБСКІ МЯСАКАМБІНАТ.

Дырэктар камбіната тав. **Пучын**, сакратар парткома тав. **Лерман**, старшыня фабкома тав. **Гуткін**.

Камбінат выканаў гадавы промфінплан **11 лістапада**.

3. ГОМЕЛЬСКІ МАШЫНА-БУДАЎНІЧЫ ЗАВОД «ПРОЛЕТАРЫЙ».

Дырэктар завода тав. **Фішбейн**, сакратар парткома тав. **Брандзін**, старшыня заўкома тав. **Паўловіч**.

Завод выканаў гадавы промфінплан **15 лістапада**.

***

Ніжэй пералічаныя прадпрыемствы—**кандыдаты на дошку гонару**. Гэтыя прадпрыемствы перавыканаліпромфінплан 10 месяцаў і першых двух дэкад лістапада.

Пры сапраўднай мабілізацыі мас, правільнай расстаноўцы сіл яны могуць і абавязаны **датэрмінова выканаць гадавы промфінплан**, і толькі тады яны будуць занесены на дошку гонару.

1. МАГІЛЕЎСКАЯ ШАЎКОВАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КУЙБЫШЭВА.

Дырэктар фабрыкі тав. **Чолах**, сакратар парткома тав. **Драбінскі**, старшыня фабкома тав. **Іванаў**. Дзесяцімесячны план фабрыка выканала на **109 проц.**

2. ВІЦЕБСКАЯ ФАБРЫКА «КІМ».

Дырэктар тав. **Марушкін**, сакратар парткома тав. **Леўтоў**, старшыня фабкома тав. **Барынава**. Дзесяцімесячную праграму фабрыка выканала на **106 проц.**

3. БАБРУЙСКІ ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ КАМБІНАТ

Дырэктар камбіната тав. **Зубовіч**, сакратар парткома тав. **Крывулін**, старшыня заўкома тав. **Нусман**. Дзесяцімесячную праграму завод выканаў на **102,2 проц.**

4. БАРЫСАЎСКАЯ ЗАПАЛКАВАЯ ФАБРЫКА «ПРОЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА».

Дырэктар фабрыкі тав. **Далінскі** сакратар парткома тав. **Бардзіянаў**, старшыня фабкома тав. **Мархель**.

На 1 лістапада фабрыка выканала гадавы промфінплан на **90,6 проц.**

5. МЕНСКАЯ ФАБРЫКА «КОМУНАРКА»

Дырэктар фабрыкі тав. **Любін**, сакратар парткома тав. **Капылаў**, старшыня фабкома тав. **Бруднер**.

Дзесяцімесячную праграму фабрыка выканала на **101,2 проц.** План першых двух дэкад выканан на **131 проц.**

ПАРЫЦКІ РАЁН ПЕРАВЫКАЎ ПЛАН ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА

СТАРШЫНІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ШТАБА ПА ДАРОЖНАМУ БУДАЎНІЦТВУ тав. СААК'ЯНУ

Парыцкі раён, уключыўшыся ў конкурс па дарожнаму будаўніцтву, разгарнуўшы вакол гэтай работы соцпаборніцтва паміж сельсоветамі, калгасамі, паселішчамі, дабіўся значных вынікаў у ліквідацыі бездарожжа ў раёне.

План дарожнага будаўніцтва ў раёне выкананы на **120,2** проц.

Прыведзена ў праезджае стаўленне **218** клм. дарог, што складае **137** проц. плана.

Прадаўжаем работу па выкарыстанню працоўнага ўдзелу кожнага калгаса, аднаасобнай гаспадаркі. Пераключаем сілы на падрыхтоўку матэрыялаў для дарожнага будаўніцтва **1935** года.

Старшыня райштаба **ПАЛЕЙ.**
Нач. райдораддзела **БУСЕЛ.**

АКТ КЛАСАВАГА ВОРАГА

ГОМЕЛЬ, 22. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»).

18 лістапада ў 6 гадзін 30 мін вечара ў вёсцы Жаробна пасля выбарчага схода стрэлам з абрэза праз вакно быў смяротна ранены лепшы ўдарнік калгаса, член сельсовета тав. **Цыркун Рыгор.** Забойца Чубкоў Аляксандр затрыманы калгаснікамі. Ён дзейнічаў разам са сваім сябрам Панікоўным Паўлам. Чубкоў імкнуўся адпомсціцца калгаснаму актыўісту.

Калгаснікі і аднаасобнікі Жаробінскага сельсовета на сходзе 19 лістапада патрабавалі ад пракуратуры тэрмінова разгледзець гэту справу і прытаварыць Чубкова і яго суўдзельнікаў да вышэйшай меры социяльнай абароны як класавых ворагаў.

Бюро Гомельскага гаркома па спецыяльным пасяджэнні абручыла пракуратуры ў трохдзённы тэрмін скончыць следства па гэтай справе і пінаватых аддаць пад суд. Сельсовету даручана аказаць дапамогу сям'і загінуўшага актыўіста.

МАРКАЎ.

Гудзінак усесаюзнай бібліятэкі імя Леніна ў Маскве часткова вызвалены ад лясоў.

На што не адказаў парторг.

Тав. **Гарэлік** — парторг 3-га калектыва завода імя Молатава—здзівіўся, калі мы нашу гутарку пачалі з пытанняў партыйна-масавай работы ў групе. Гэта было для яго нечаканасцю. Звычайна ён прывык гаварыць аб вытворчых справах, а тут раптам:

— Як члены партыі павышаюць свой тэарэтычны ўзровень?

— Як яны наведваюць палітзаняткі?

— Якасць вучобы і паспяховасць?

На гэтыя пытанні адказаць было трудна. І зразумела чаму—тав. Гарэлік не займаецца партыйна-масавай работай. Яго работа, як партарганізатара, заключана выключна вытворчымі пытаннямі. Сакратар парткома тав. **Скорман** з свайго боку патрабуе ад парторгаў толькі аднаго:

— Дай промфінплан!

Іменна так характарызуе сам т. Гарэлік кіраўніцтва парткома.

— Дапамогі ў рабоце ад парткома я не маю. Затое пагрозы, камандаванне — звычайная справа. Кожную сваю дырэктыву тав. Скорман абавязкова дапаўняе недвухсэнсным пагрозай:

— Дрэнна правядзеш работу, адбяру партбілет.

Партком не праводзіць нарад з парторгамі. Тав. Гарэлік не памятае таго часу, калі яны былі.

Чым займаецца парторг тав. Гарэлік?

Для гэтага ён просіць ачакаць і яго дзённікам. Чытаем: 28 жніўня (пачатак запісаў)—аб спазненні Цфасмана на партсход. 30 жніўня—сход рабочых аб 20-м МІОД'е.

2 верасня — чытка газеты.

5 верасня — сход рабочых аб сустрэчы Варашылава.

11 верасня — сход рабочых аб зрыве промфінплана.

25 верасня — сход рабочых аб вылучэнні ўдарніка.

27 верасня — чытка газет.

30 верасня — сход партгрупы —справаздачы Ідэльчыка, Манціна, Тоцеева, Лагуцька, Эдзеладовіч і Цфасмана.

На гэтым запісы дзённіка канчаюцца. Як відаць, ён больш падобны да справаздачнай ведамасці, якая ў храналагічным парадку фіксуе праведзеную работу ўсім заводскімі арганізацыямі, чым да дзённіка парторга. Праўда, сход ад 30 верасня з'яўляецца нібы першай спробай займацца сапраўды ўнутрыпартыйнымі пытаннямі; але і тут пастаноўка па адным сходзе адразу шасці справаздач не магла не адбіцца на актыўнасці і дзеяздольнасці абгаварання пытання.

Якія нагрузкі маюць члены партыі і як яны выконваюць іх тав. Гарэлік не ведае. Пры праверцы-ж аказалася, што акрамя аднаго (партпрымацаванага) ні адзін член партыі не мае партнагрузкі.

Па заяве тав. Гарэліка, усе члены партыі і спачуваючыя (усяго ў групе 7 членаў, адзін кандыдат партыі і 3 спачуваючых) ахоплены партвучобай. Але як яны наведваюць заняткі, якая паспяховасць, ці забяспечаны яны літаратурай, як паспул яны працуюць над павышэннем палітычнага і культурнага ўзроўню — на гэта ён адказаць не можа.

— цікавіцца, не цікавіўся гэтым,—цьвідзнаецца ён.

А факты гавораць аб тым, што партучоба ў заводскай партыйнай арганізацыі пастаўлена зусім слаба. Партком, парторгі не дабіваюцца, каб кожны комуніст павышаў свой тэарэтычны ўзровень, чытаў мастацкую літаратуру, газеты. Фармальна, абы з рук, адносіцца партком і да палітычнага выхавання спачуваючых.

Мы гаварылі з паасобнымі комуністамі і спачуваючымі, каб выявіць іх тэарэтычны і культурны ўзровень.

Вось тав. **Ідэльчык**, член партыі з 1925 года. Ён чыстасарлёчна прызнаецца, што хоць і пішае «Правду» і «Рабочай», але не чытае іх. Аб кніжках і журналах і гаварыць не прыходзіцца. Як я найбольш важныя міжнародныя падзеі адбіліся за апошні час — тав. Ідэльчык не ведае. Пра іспанскія падзеі ён усяго толькі мог сказаць:

— Там, здаецца, стачка гарнякоў.

На пытанне «Чаму СССР уступіў у Лігу нацый?» тав. Ідэльчык не мог адказаць.

— Аб гэтым адразу не адкажаш, трэба падчытаць. — гаворыць ён.

Спачуваючая тав. **Кацовіч** займаецца ў заводскім вучэбным камбінаце. Затрудняе вучобу адсутнасць палітычнай літаратуры. Няма ў яе гісторыі партыі і не ведае, дзе дастаць. Ніхто-ж з парткома і сам парторг аб гэтым яе не пытаў і не цікавіўся яе работай па павышэнню палітычнай асветы. Тав. Кацовіч выпісвае «Звязду», але прызнаецца, што рэдка калі чытае, таму што слаба разбіраецца ў міжнародных і палітычных пытаннях. Ніхто і ў гэтым ёй не дапамог. Прыкладна тое-ж самае расказваў і другі спачуваючы тав. Алай. Партком ні разу іх не склікаў, не высвятляў іх патрабаванняў.

Большасць членаў і кандыдатаў партыі групы тав. Гарэліка чытаюць неакуратна або зусім не чытаюць газет і журналаў. Тав. Гарэлік і сам грэшны ў гэтым. У дзень нашага наведвання ў 10 г. вечара ён яшчэ газет не чытаў. Аб белатрыстыцы ён проста заявіў, што ўжо тры гады як не чытае яе. Ён не мог назвать адказаць на пытанне «Хто аўтар «Падняцай цаліны?».

Групу тав. Гарэліка на заводзе лічаць адной з самых лепшых. Можна ўявіць пасля гэтага, у якім становішчы знаходзіцца ўнутрыпартыйная і масавая выхаваўчая работа ў іншых групах.

Р. ДОДЗІН.

Конь «Гога», 12 г., вытворнік пароды Брасансон на Усебеларускай выстаўцы атрымаў 1 прэмію. Калгас імя Закуўскага, Слуцкага раёна.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

УПАЎНАВАЖАНАМУ НАРКОМЛЕСА тав. РОЗІНУ

УСЁ АБЯЦАЮЦЬ

У аддзеле рабочага снабжэння **Віцебскага** лесгаспгаса і сплаўканторы доўгі час арудавалі злоўжэнні, праходзілі якія раскралі больш 30 тыс. руб. грошай. Зараз гэта шайка выкрыта і аддана пад суд.

Але работа ОРСа не паляпшаецца, а пагаршаецца. Фінансавае становішча вельмі запрутанае. **Запазычанасць** банку і іншым арганізацыям **складае звыш 70 тысяч руб.** Прыбываючыя для снабжэння лесарубаў і сплаўшчыкаў прадукты (хлеб, цукар, крупа, макароны і інш.) **нізма за што выкупаць. Нарады** на 19.000 руб. ляжаць неаплочанымі.

Аб гэтым добра ведае начальнік галоўнага ўпраўлення рабочага снабжэння Лесбела тав. **Капароўскі**, але ніякіх мер не прымае. Будучы ў Г'цебску, старшыня БРК саюза тав. **Мархашоў** абяцаў дапамагчы, але таксама нічога практычнага не зрабіў.

Рэдактар газеты «Ударнік лесасплаву» Л. СТЭРКІН.

САКРАТАРУ ПУХАВІЦКАГА РК КП(б)Б тав. СКАРАХОДУ

ГРОШЫ ПЛОЦІМ, А ГАЗЕТ НЕ АТРЫМЛІВАЕМ

(ПІСЬМО СТУДЭНТА)

Загадчык **смілавіцкай** пошты (Пухавіцкі раён) **Шчорбак** займаецца злоўжываннем. Студэнты сельскагаспадарчага тэхнікума выпісаныя газеты **«За социалистическое земледелие»**, **«Комукар»** і іншыя на верасень месяц ні аднаго нумара не атрымалі.

Калі запытаешся ў Шчорбака, чаму няма газет, ён адказвае: **«Атрымаеце ў наступным месяцы».** Прэзідыум РВК тры разы знімаў Шчорбака з працы за п'янку, растрату дзяржаўных грошай.

Але хто сочыць у Пухавічах за гэтымі пастановамі.

Шчорбак і зараз, знаходзячыся на працы, працягвае свае ранейшыя справы.

САСІЦКІ.

САКРАТАРУ ДЗЯРЖЫНСКАГА РК КП(б)Б тав. ДАМБРОЎСКАМУ

БЫЛЫ КСЁНДЗ КІРУЕ КАЛГАСАМ

(ПІСЬМО ЧЫРВОНААРМЕЙЦА)

У нацыянальна-польскі калгас імя **Дзержынскага** (Дзержынскі раён) пралезлі класава-чужыя элементы—кулакі, лодыры і інш.

Працаздольных у калгасе 102 чал., а на работу выходзіла толькі 80. Брыгадзіры Кацуба і Махор'еў сам агітуюць за невыхад на работу.

Паліт-масавая работа сярод калгаснікаў не праводзіцца. Замест гэтага—голае адміністраванне, штрафаванне і інш. Парторг калгаса **Малкін** на гэта не звяртае ўвагі.

Кіраўніцтва калгаса вельмі часта мяняецца. Раней старшынёй калгаса працаваў нехта **Бурылін**, які растрацў калгасныя грошы і, нарабіўшы шмат іншых злачынстваў, скрываецца. Зараз старшынёй працуе былы ксёндз **Кацуба Карп**, які зняты з работы ў сельню.

З боку райса няма кіраўніцтва калгасамі.

КАЦУБА.

По слядах пісем

„КУЛАКІ ПАД АПЕКАЙ СЕЛЬСОВЕТА"

Пад такім загалоўкам у **«Звязде»** за 18 ліпеня было змешчана пісьмо **Залуцкага**, сына якога знаходзіцца ў Чырвонай армії.

Пухавіцкі РВК паведамляе, што **факты пацвердзіліся.** Пастановай прэзідыума РВК знята абкладання гаспадарні Залуцкага 1.000 руб., як ніправільна налічаных сельсоветам. Прапанавана **райфа** праверыць правільнасць **налічэння** сельгаспадатку гаспадаркам **Плашчынскага Ярома, Мендрык Ніны, Плашчынскага Антося** і іншых.

За нячулыя адносіны да скарг чырвоаармейскай сям'і старшыні Рудзінскага сельсовета **Андросіку АБВЕШЧАНА ВЫМОВА.**

По слядах неапублікаваных пісем

Старшыня калгаса **«Барацьба»**, Яноўскага сельсовета (Веткаўскі раён) Сычоў і яго намеснік Ганчароў Сцяпан зажымаюць самакрытыку. Калі пастаўнік Казлоў крытыкаваў праўленне калгаса за п'янства і пагнаенне сена, то Сычоў і Ганчароў прышылі яму, што нібыта ён вядзе кулацкую агітацыю і хацелі выключыць з калгаса. Аб гэтым нам пісаў калгаснік **Казлоў.**

Райком КП(б)Б паведамляе, што факты **поўнасцю пацвердзіліся.** Ганчароў і Сычоў **з работы зняты і перададзены суду.**

***

Загадчык канічаўскай школы, Хальчанскага сельсовета, **Веткаўскага раёна**, пісаў у **«Звязду»**, што старшыня гэтага сельсовета Галыгін разбазарыў грошы, вызначаныя на паліт-тэхнічнае абсталяванне школы. У школе няма ні піны для рэзкі дроў, ні тапара; няма таксама і дроў для апалу школы.

Як паведамляе Веткаўскі **РВК**, старшыня Хальчанскага сельсовета Галыгін **з работы знят**, а рахунак на закупленыя рэчы для школы **аплочан**.

***

Селькор **Мікола Сікорын** пісаў аб дранежніцкіх адносінах да коней у калгасах **Ардацкага сельсовета.**

Шклоўскі райсамадзел паведамляе, што факты **поўнасцю пацвердзіліся.** Старшыня калгаса **імя Калініна Кісалёў** знят з работы і аддан пад суд. Старшы коніх калгаса прысуджан да 6 месяцаў прымусовых работ.

***

Селькор **Сушкевіч** у сваім пісьме ў рэдакцыю паведаміў аб безгаспадарчасці і злачынстве ў калгасе **«Змагар» Іканскага сельсовета, Бягомльскага раёна.**

Як паведамляе **Бягомльскі РВК**, старшыня калгаса «Змагар» Рабцэвіч з работы знят і выключан з партыі.

ЮБІЛЕЙ МАЙСТРА СОВЕЦКАГА ТЭАТРА ЗАСЛУЖАНАГА АРТЫСТА РЭСПУБЛІКІ М. Ф. РАФАЛЬСКАГА

ЛЕЎ ЛІЦЬВІНАЎ

заслужаны артыст рэспублікі

З увагай і пяшчотай рыхтуецца наша партыйная, пролетарская, культурная і тэатральная грамадскасць да святкавання 25-гадовага юбілея работы на сцэне арганізатара і мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР, заслужанага артыста рэспублікі Міхаіла Фадзееіча Рафальскага.

З упэўненасцю можам мы сказаць, што юбілей Міхаіла Фадзееіча Рафальскага дае нам магчымасць падагуліць не толькі работу аднаго тэатра (хоць-бы і такога дасканалага мастацкага арганізма, якім з'яўляецца ім арганізаваны і незменна кіруемы Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР). Юбілей тав. Рафальскага падагульвае выдатны шлях лепшых прадстаўнікоў дарэволюцыйнай мастацкай інтэлігенцыі, шлях ад ліберальнага «прыняцця» Окцябра да знаходжання свайго месца ў радах партыі.

Першапачатковую тэатральную асвету М. Ф. Рафальскі атрымаў у Кіеве, у тэатры б. Салаўцова, і першыя крокі рабіў на рускай драматычнай сцэне ў якасці актора. Гэты перыяд работы тав. Рафальскага нічым выдатным не адзначаўся і, я думаю, не пакінуў глыбокага следа на стадыйнай дарозе яго далейшай тэатральнай дзейнасці.

Але ўжо ў 1917 годзе разгортваецца незвычайны арганізатарскі талант тав. Рафальскага, які сунуў з пачаткам яго работы на яўрэйскай сцэне. Я маю на ўвазе арганізацыю тав. Рафальскім у Харкаве яўрэйскага тэатра «Унзер вінкл» («Наш кут»). Гэты тэатр праіснаваў да 1921 года і не паспеў скласціся ў цэльны мастацкі арганізм, а, значыць, і не мог пакінуць колькі-небудзь прыкметнага следу ў гісторыі совецкага яўрэйскага тэатра.

Артыст РАФАЛЬСКІ.

Тым не менш тэатр «Унзер вінкл» не павінен быць абыйдзены маўчаннем будучым гісторыкам яўрэйскага тэатра, бо калектыў гэтага тэатра — на чале з М. Ф. Рафальскім—хацеў узяць благародны раванш на моры пашляцёны, апярэтачнай парнаграфіі, залічыцца яўрэйскі тэатр напярэдадні революцыі.

Тэатр гэты скончыў свае дні ў Менску, дзе быў расфармаваны, а тав Рафальскі ў Менску застаўся (1921 г.).

У Менску тав. Рафальскі збірае групу яўрэйскай рабочай моладзі ў маленькую студыю — калыбель будучага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР.

У 1922 г. пастановай партыі і ўрада быў арганізаваны ў Маскве беларускі Тэатральны інстытут з двума секцыямі — беларускай і яўрэйскай. У Маскву паехалі Рафальскі — кіраўнік секцыі і яго вучні (іх у Маскве іранічна называлі «Хедэр Рафальскага»).

Нацдэмаўскае контрэволюцыйнае кіраўніцтва Наркомасветы і яго агенты ў студыі рабілі ўсё, каб атрушць існаванне студыі, зламаць яе работу, выжыць яе. Любыя спробы пускаліся ў ход. Але ім не ўдалося зламаць жалезнай упартасці Міхаіла Фадзееіча. Ён заўсёды знаходзіў прамую дарогу да партыі. І студыя жыла, вучылася, і вырасла ў такі моцны тэатральны арганізм, якім цяпер з'яўляецца Беларускі Дзяржаўны яўрэйскі тэатр.

У тэатры М. Ф. Рафальскі шчыпаваў над двума цыклямі тэм—а) рэвалюцыйная рамантыка—«Ботвін», «Лекерт», «Партызаны», «Забастоўка жняцоў»; б) яўрэйская класіка —«На пакаяным ланцугу», «Хейдэр», «Ментчі», «Гаухі», «Рэкрут». Цяжка яшчэ гаварыць аб «Забастоўцы жняцоў», бо работа гэта яшчэ не закончана. Астатнія работы гэтага цыкла гавораць аб тым, што, як рэжысер, М. Ф. Рафальскі напружана шукае форм поўнакроўнага выяўлення матэрыялаў гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы. Недастаткова добранасны літаратурны матэрыял «Ботвіна», «Партызан», які М. Ф. не здолеў перарабіць абумоўіў рад ідэйна-мастацкіх зрываў у гэтых работах па лініі элементаў натуралізма, схематызма, меладраматычнасці.

Але, побач з гэтымі недахопамі ў гэтых-жа пастаноўках у палучнасці вялікі зарад сапраўднага социяльнага пафаса, лірыкі, добрай рэвалюцыйнай рамантыкі. Рад вобразаў — Ботвін, Піонткоўскі, п'яніцышчык, Вальпэр, Аўрэмеле ўвойдуць у актыў вобразаў ДАЯТ, рад мізансцэн (дэманстрацыя ў «Ботвіне», расстрал Ботвіна, пахаванне Аўрэмеле і інш. «Партызаны») з'яўляюцца значнымі дасягненнямі рэжысерскага майстэрства і культуры.

«Лекерт» — адна з фундаментальных работ ДАЯТ. Скупая, лакончная форма спектакля, дасканалая чытка верша, пластычнасць многіх мізансцэн (напрыклад, «Пасля экзекуцыі»), насычанасць тэмпераментам, здаровае пачуццё сцэнічнага рэалізма ў абрысоўцы дзейных асоб — робяць спектакль каштоўным укладам у гісторыю совецкага яўрэйскага тэатра.

Да цяперашняга часу з-пад рэжысерскай рукі М. Ф. Рафальскага яшчэ не выйшаў спектакль, пабудаваны на тэматыцы нашага социялістычнага будаўніцтва (калі не лічыць «Баранцоў машын» — проста дрэнная п'есы). Але зусім вядомна, што імённа назвалы цыкл спектакляў з'яўляецца падрыхтоўкай рэсысера да сцэнічнага ўцелаўлення совецкай тэмы. І наш глядач мае безумоўна права патрабаваць ад М. Ф., як і ад усяго калектыва тэатра, хутчэй паказаць такі спектакль, які адлюстраваў-бы велічэнную эпоху, героіку нашай рэчаіснасці.

Яшчэ больш цікавы і значны шлях пройдзен М. Ф. Рафальскім у яго рабоце над другім цыклам тэм — яўрэйскай класікай.

Першы спектакль гэтага цыкла — «Хейдэр» быў вельмі шматзабаўчым. У маленькай пастаноўцы мачаліва спалучаліся вострасць і свежасць нацыянальнай формы з рэвалюцыйным зместам антыклерыкальнага парадку. «Хейдэрам» будучы ДАЯТ прагучэў як баявы комсамольскі калектыў, таленцілівы і рэвалюцыйны і такія-ж якасці выявіў яго кіраўнік М. Ф. Рафальскі.

Праз пару год М. Ф. паставіў адну са значнейшых сваіх работ — «На пакаяным ланцугу» Перэца. М. Ф. Рафальскі ў той перыяд з'яўляецца вялікім пакланнікам гэтага амрочнага таленту.

Некрытычнае захапленне Перэцам, вялікі ўплыў таленту'ва зробленага містычнага «Галубка» жыве ня ніжэйшае ў той перыяд М. Рафальскім нацыяналістычнае захапленне і абапіраецца на таленту'ва зроблены спектакль. Настрої яўрэйскага гетто ў ім не былі выдумачаны перамоганы, яны былі ўспеты, абвешаны глыбокай дірыкай, сумам.

У «Гаухім» моцны рэвалюцыйныя тэндэнцыі, але поўнай перамогі над астаткамі нацыянальнай абмежаванасці яшчэ няма. Працэс перабудовы мастака ідзе пакручаста.

У 1933 годзе М. Ф. Рафальскі атрымлівае вялікую перамогу, якая падводзіць вынік яго напружаным пошукам крытычнага асваення нацыянальнай класікі. Я маю на ўвазе пастаноўку «Рэкрут» па Аксенфельду, у аўтарэдакцыі Л. Рэзніка.

«Рэкрут» пранізан жыццецвярджаючым светаадчуваннем класагемона; тут выразна расстаўлены і мастацка поўнакроўна акрэслены класавыя сілы, тут вострая і свежая нацыянальная форма, дэмакратычныя элементы фальклора з рэвалюцыйным, ускрыццём пістарычнага асяроддзіча.

Зараз М. Рафальскі знаходзіцца ў перыядзе росквіту спедага майстра і, несумненна, будзе атрымліваць шмат перамог на далейшым сваім шляху. М. Рафальскі прадстае перад намі як мастак-рэаліст і разам з тым рамантык. Яго работы заўсёды надзвычай эмацыянальны, сцэнічна жывапісны і рытмічны. Рафальскі — майстар скульптурны мізансцэн. Рафальскаму чужы дух пагоні за вонкавым сцэнічным трукацтвам, яго шлём заўсёды асмыслены, мэтаімкліўны, апраўданы, арганічны. Рафальскі — мастак прыцымовы. Рафальскі — мастак сінтэтычнай манумэнтальнай формы і жанра, мастак патэтычнай і лірычнай тэмы, чужы паўучай бытавічыне, заўсёды эмацыянальны.

Вельмі цікава і значна фігура Рафальскага — кіраўніка Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра.

Арганізатар і пазнаны выхавальна і кіраўнік студыі, а потым і тэатра, ён, пры дапамозе ўсёй партыйнай і совецкай грамадскасці, вёў яго праз перамогі, зігзагі і хвалёбы росту да яго цяперашняга стану — першакласнага мастацкага арганізма, вядучага тэатра сярод яўрэйскіх совецкіх тэатраў Саюза.

Пад кіраўніцтвам М. Рафальскага тэатр выхаваў рэжысёраў—заслужанага артыста рэспублікі мастацкага кіраўніка БДТ-І Л. Літвінава, Б. Норда — рэжысера МХАТ-ІІ, А. Айзенберга, В. Галаўчынера (зараз рэжысера ДаЯТ).

Тэатр на чале з тав. Рафальскім выхаваў дасканалых акторaў-майстраў Ю. Арончык, К. Рутштайна, М. Сокала, А. Трэпеля, П. Вольпіну, М. Мойна, Э. Драйціну, М. Альтман, М. Рывіна, Ф. Цыпкіна, Б. Лімона і ўрад іншых. І гэта не толькі акторы, гэта — ансамбль, калектыў, тэатр'са значнымі адзнакамі пэўнага твару. Прызнанне і высокая ацэнка Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, Одэсы і інш. суправаджаюць работы тэатра, які знаходзіцца, як і яго кіраўнік, у росквіце вялікіх творчых сіл.

Увесь рэпертуар Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра сведчыць аб тым, што Рафальскі — кіраўнік, працуючы многа над пошукамі нацыянальнай формы, заўсёды стаіў на варце выканання задач інтэрнацыянальнага выхавання, стаяўшых перад тэатрам.

Мы ўшаноўваем культурнага і таленцілівага мастра совецкага тэатра, большэвіка-арганізатара і кіраўніка яго, чулага чалавека і ўпартага бойца.

Карыстаюся трыбунай газеты, каб у прыняцельскім голасе пролетарскай грамадскасці прагучэў і мой голас слядзячага прывітання майму таленцілівому выхавальцу і другу М. Ф. Рафальскаму з нагаданнем многіх год таленцілівага рэвалюцыйнага жыцця.

За рубяжом

У ЛІГЕ НАЦЫЙ

РАЗГЛЯД УЗБРОЕНАГА КАНФЛІКТУ ПАМІЖ БАЛІВІЯЙ І ПАРАГВАЕМ

ЖЭНЕВА, 22 лістапада. (БЕЛТА). Учора адбылося пасяджэнне камітэта Ліг нацый па канфлікту Балівія—Парагвай. Камітэт заслухаў заявы прадстаўнікоў Балівіі і Парагвая. Прадстаўнік Балівіі заявіў, што Балівія згодна на працягу месяца даць адказ, прымае яна рэкамендацыі камітэта ці не. Прадстаўнік Парагвая ў адсёлым тоне ў адносінах да Лігі нацый адхіліў рэкамендацыі камітэта, заявіўшы, што самое абмеркаванне іх у парагвайскім парламенце несумяшчальна з суверэнітэтам краіны. Ён папракаў камітэт Лігі нацый у невуцтве, яведанні ўмоў вайны ў раёне Чако і настойваў, што рэкамендуемыя камітэтам меры выгадны толькі Балівіі, якой яны далуць, моў, магчымасць апраўвіцца і падрыхтавацца к адпаўленню ваенных дзеянняў. Затым ён заявіў, што Парагвай пачанае спыненне ваенных дзеянняў пры захаванні сучаснай лініі фронта, правядзенні ўсеагульнай дэмабілізацыі з абодвух бакоў і скарачэнні іх узбраенняў пад міжнародным кантролем.

Прывёўшы гэтыя пункты, прадстаўнік Парагвая ў ірані чнай форме прасіў Лігу нацый, калі яна не адольна выканаць гэтыя пункты, уступіць месца пасрэдніцтву якой-небудзь амерыканскай дзяржавы.

Сёння раніцой засядала вылучэнная камітэтам Лігі нацый падкамісія ў складзе прадстаўнікоў Чэхаславакіі, Чылі і Аргентыны, якая павінна заняцца канкрэтным пераглядам рэкамендацый.

У ІСПАНІ ЗАБІТА 5 ТЫСЯЧ ГАРНЯКОЎ

ЛОНДАН, 21 лістапада. (БЕЛТА). У штотыднёвіку **«Нью-лідэр»** вядомая лейбарыстская дзеячка **Вількінсон**, зрабіўшая паездку па Іспаніі, паведамляе, што там было забіта не менш 5 тыс. гарнякоў, прычым многія з іх былі пакараны смерцю пасля баёў. У турме для палітычных, якую паведала Вількінсон, зняволеныя рабочыя неаднаразова звярталіся да яе з адзіным словам **«Астурыя»**, намякаючы, што яна павінна азнаёміцца са становішчам у гэтай правінцыі. Калі Вількінсон сцвярджальна ківала галавой, рабочыя выказвалі задаваленне.



СУЧАСНЫ КІТАЙ. Мацнейшая эканамічная адсталасць Кітая і страшэнная галеча шырокіх мас прадпаўных — робяць выгадным скарыстанне чалавечай сілы не толькі замест машын, але і замест жывёлы. НА ЗДЫМКУ: людзі замест коняй — перавозка грузаў людзьмі.

„ЧЫСТКА" ШТУРМАВЫХ АТРАД Ў БУДЗЕ ПРАДОЎЖАНА

ЛОНДАН, 21 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляе «Дэйлі Геральд», камандуючы рэйхсверам генерал Бломберг у дакладзе Гітлеру прапачыць супроць хадайніцтва начальніка штаба штурмавых атрадаў Лютцэ захаваць штурмавыя атрады ў якасці рэзерва рэйхсвера з колькасцю ў 800 тыс. чалавек. Бломберг указвае, што па ступені дысцыплінаванасці, маральнага і фізічнага становішча штурмавікі займаюць апошняе месца. Грунтуючыся на дакладзе — указвае газета — Гітлер рашыў, што «чыстка» штурмавых атрадаў павінна быць прадоўжана. Аднак, згадзіўся адтэрмінаваць «чыстку» да скачэння саарскага плебісцыта.

ПОЛЬШЧА БУДУЕ ЧЫГУНКІ СТРАТЭГІЧНАГА ЗНАЧЭННЯ

ВАРШАВА, 22 лістапада. (БЕЛТА). 24 і 25 лістапада адбудзецца ўрачыстае адкрыццё нова-пабудаваных чыгуначных веткі: Варшава—Радам і Мехавіцы—Кракаў. Новая лінія значна скароціць шлях ад Варшавы да Кракава. Новая лінія Варшава—Радам палепшае чыгуначныя зносіны ў так званым «трохкутніку бязпаснасці»: Радам—Кельцэ—Модлін, дзе сканцэнтравана прамысловасць, што працуе на абарону.

ФРАНЦУЗСКІ ДРУК АБ УСХОДНІМ ПАКЦЕ

ПАРЫЖ, 22 лістапада. (БЕЛТА). Друк адзначае значнасць учарашняга дня ў Жэневе, прычым у цэнтры ўсеагульнай увагі — наведванне Лавалем тав. Літвінава. Газеты адзначаюць, што гутарка цягнулася звыш 2-х гадзін і насіла, як піша «Пці парыз'ен», шчырасардэчны характар не толькі ў дыпламатычным сэнсе. Рад газет змяшчаюць адымкі гутаркі Літвінава з Лавалем.

Друк указвае, што гутарка ішла перш за ўсё аб усходнім пакце. «Эвр» заяўляе: «У праблеме ўсходняга пакта і ў справе франка-совецкага супрацоўніцтва зроблен значны крок наперад». Згодна вестак газеты, Лаваль запаўніў Літвінава, што перагаворы аб усходнім пакце будуць рушаны цяпер з максімальнай хуткасцю, што адказ Польшчы адпраўляецца ў Варшаву, і думка яе будзе запытана ў найкарацейшы тэрмін.

300 ТЫСЯЧ ЭКЗЕМПЛЯРАЎ „ЮМАНІТЭ"

ПАРЫЖ, 22 лістапада. (БЕЛТА). «Юманітэ» паведамляе, што ўчора яе тыраж дасягнуў рэкордная лічбы—269.000 экземпляраў. Газета ставіць задачу падняць тыраж да 300.000.

ФРАНЦЫЯ АБНАЎЛЯЕ АВІЯЦЫЮ

ПАРЫЖ, 22 лістапада. (БЕЛТА). Міністр авіяцыі **Дэнен** заявіў у парламенцкай камісіі па справах авіяцыі, што палата прагаласавала ў мінулым годзе надзвычайныя крэдыты на абнаўленне французскай авіяцыі ў размеры трох мільярдаў франкаў па трохгадовы тэрмін, а 1934 да 1937 г. У бягучым годзе з гэтай сумы было страчана 500 млн. Дэнен патрабаваў, каб астатак быў перанесен на бюджэт наступнага года.

Паміма гэтага, Дэнен прасіў прадаставіць міністэрству авіяцыі ў нармальным бюджэтным парадку 1 мільярд 500 млн. на 1935 г.

Згодна заяўленню Дэнена, з'явіўшыеся ў друку весткі, быццам Германія мае 50 тыс. ваенных самалётаў, няверны. Згодна вестак Дэнена, да 1934 г. Германія мела толькі камерцыйныя самалёты, якія ў выпадку неабходнасці могуць быць прыстасаваны для ваенных мэт. Становішча вельмі змянілася з назначэннем Герынга міністрам авіяцыі, які арганізаваў вытворчасць спецыяльных ваенных самалётаў.

Несумненна, аднак—заявіў Дэнен,—што французская авіяцыя мацнейшая за германскую. Перавага Германіі заключаецца толькі ў тым, што Берлін далей ад граніцы, чым Парыж, што стварае для апошняга непасрэдную пагрозу паветранага нападу. Затым, германская авіяцыя складаецца з самалётаў, пабудаваных па апошняму слову тэхнікі, у той час як французская авіяцыя мае многа ўстарэўшых. Вось чаму праблема абнаўлення французскага паветранага флота мае вялікае значэнне.

У заключэнне Дэнен адказаў на пытанні аб пабудове падземных ангараў і плывучых аэрадромаў на якіяне, якія маркуецца будаваць у супрацоўніцтве з Англіяй.

ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА ВАЕННЫЯ РАСХОДЫ

ПАРЫЖ, 22 лістапада. (БЕЛТА). Учора ваенная камісія палаты дэпутатаў Францыі пацвердзіла патрабаванне ваеннага міністэрства аб дадатковых крэдытах у 800 млн. франкаў, якія трэбаваў яшчэ былы ваенны міністр Петэн, матываваўшы перад камісіяй гэтыя расходы пагражаючым ростам германскіх узбраенняў.

РАУНЯЦЦА ПА «ПАЛІТАДДЗЕЛЬСКАЙ ПРАЎДЗЕ"

* Хойніцкая раённая газета **«Ленінскі сцяг»** і палітаддзельская газета **«Палітаддзельская праўда»** уносяць на пабудову агітвяна 1.705 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

Лепшы прыклад у зборы крошай паказалі рабочыя вінзавода **Страліч**; яны ўнеслі 450 руб.; калгаснікі калгаса «Рассвет» унеслі 386 руб., калгаснікі калгаса «КІМ» — 150 руб., калгаснікі калгаса «Большэвік № 1» — 115 руб.

«Палітаддзельская праўда».

* Фабрыка **«Везувій»** (Гомель) на пабудову агітвяна ўносіць 238 руб., інвалідная каапераця — 265 руб. Усяго па Гомелю сабрана на пабудову агітвяна 2.573 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

ШЛЕЙХМАН.

* На пабудову агітвяна рэдакцыя **«Сцяг Окцябра»** (фабрыка «Окцябр») уносіць 746 руб.

ПАДОЛЬСКАЯ.

* Рэдакцыя газеты **«Будзённавец»**, орган палітаддзела 59-га конесоўтаса, уносіць 458 руб. 35 кап.

ІОФЕ.

* Рэдакцыя райгазеты **«Калгасны сцяг»** (Чавусы) уносіць 600 р. Вучні старэйшых класаў Самулкаўскай няпоўнай сярэдняй школы сабралі 90 руб. Рэдкалегія райспажыўсаюза — 92 руб., транспартная арцель — 84 руб. і т. д.

САЛОДКІ.

Спачатку збору ў фонд пабудовы агітвяна імя 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў паступіла 27.553 руб.

Сродкі на пабудову агітвяна трэба пералічваць у беларускае аддзяленне Дзяржбанка на бягучы рахунак № 160/10006.

Шахматы і шашкі

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЕРСКАГА



Этюды **Н. Д. Грыгор'ева** (Масква)

(З кнігі А. О. Гербстман шахматны эцюд).

№ 1.

Бел. Крс4 пп d3, g6 (3)
Чорн. Крс6 пп e5, g5 (3)
Белыя выіграюць.

№ 2

Бел. Крd1, ппа4, с4(3)
Чорн. Крb6, ппа3, d6 (3)
Белыя робяць нічыю.

Этюды Н. Д. Грыгор'ева на першы погляд зусім простыя, бо нязжка вылічыць усе магчымыя хады з кожнага боку. Аднак-жа не ўсё так просты!

Этюд № 1. Як дасягнуць мэты? Зразумела, трэба адцягнуць чорнага караля ад абароны пешкі е5, яе заваяваць і потым заваяваць пешку g5; але трэба манеўраваць так, каб чорны король не заняў аказіцыі, бо інакш нічыя.

1. g7, Крf7, пешка е5 засталася без абароны, аднак-жа ўзяць яе нельга, бо будзе нічыя (2. Крс6; Крg7; 3. Крf5; Крf7; 4 Крg5; Крс 1 нічыя). Таму белыя іграюць 2.Крf5! Крg8! (Калі 2... Крg7; то Крg5: белыя падыходзяць да пешкі е5 і выіграюць) 3. Крg4! (і цяпер яшчэ нельга ўзяць пешкі g5, бо е5—е4!, dе:Крg7; і нічыя. Калі-б чорныя не аддалі пешкі е5, а сыгралі-б Крg7; то пасля ходу белых Крf5 чорныя прайграюць) 3... Крf7; 4. Крg5: што робіць чорным? Калі 4... Крg7:, то Крf5 і выіграюць. Таму чорныя робяць апошнюю спробу 4...е5—е4 і калі белыя сыграюць dе:, або d5, то Крg7: і нічыя, але 5. Крb6! і барацьба закончана: на Крg8 выіграе 6. d4:е5, а на е5:d4, выіграе Крh7.

Этюд № 2 таксама ў рашэнні мае рад цікавых момантаў (знайдзіце іх). Такія этюды неабходна дэтальна вывучаць, што безумоўна павысіць кваліфікацыю.

У вышэйшай з друку кніжцы А. О. Гербстмана „Шахматны этюд у СССР" сабраны выдатныя творы совецкіх праблемістаў. У кніжцы даны не толькі рашэнні этюдаў, а галоўнае даволі падрабязна ўскрыты ідэі этюдаў. Вывучэнне этюдаў дасць многа карысці для паглыблення шахматнай ігры.

МЕНСК

МАГАЗІН „ГАСТРАНОМ"

Народны камісар унутранага гандлю Саюза тав. **Вейцэр** аддаў загад аб арганізацыі ў Менску спецыялізаванага магазіна «Гастраном» і стварэнні канторы «Белгастраном». У асартыменце тавараў будуць: белы хлеб, рыбныя тавары, ікра, кансервы рыбныя, масла расліннае, сыр, мясапрадукты, масла кароўе, кандзіцерскія вырабы, віна-гарэлачныя вырабы, какао, кофе і інш. На абсталяванне першага ў Беларусі магазіна «Гастраном» адпушчана 100.000 руб.

* **РОЗЫГРЫШ НА ГАРАДСКОЕ ПЯРШЫНСТВА** па валейболу вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў праводзіцца з 24 на 27 лістапада. Розыгрыш пачынаецца з 12 гадзін дня сёння, у залах усебеларускага стадыёна і першай школы.

РАЁННЫ З'ЕЗД СОВЕТАЎ

Першы раённы з'езд советаў Менскага раёна намечан на 5-10 снежня. У ім прымуць удзел 130 дэлегатаў, а таксама ўсе старшыні калгасаў, загадчыкі лепшых МТФ і лепшыя брыгадзіры паляводчых брыгад. У парадку дня справаздача оргбюро РВК, культбудаўніцтва ў раёне, выбары РВК і дэлегатаў на ўсебеларускі з'езд советаў. Створана арганізацыя з пяці чалавек пад старшынствам тав. **Жарына.**

ПАВЕДАМЛЕННЕ

25 лістапада ў 8 гадзін вечара ў вялікай зале Дома партактыва адбудзецца вялікі літаратурны вечар, прысвечаны яўрэйскаму совецкаму пісьменніку **Перацу Маркішу.**

Білеты можна атрымаць у Доме партактыва, пакой № 22.

Дом партактыва.

Адказны рэдактар **Н. ЛЕНЦНЕР.**

ЛЕНІНГ
ЧАПАЕЎ

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" — Гукавы маставік фільм **ПЕСНЯ аб ШЧАСЦІ** (ТАЙНА КАВЫРЛІ)

Гукавы кіно-тэатр „Гісцетарый" — Маста кі фільм ДРАМА ў 5 частках **ЦУДА**

Кіно Інтэрнацыянал — Вялікі маставіцкі фільм **БЛУКАЮЧЫЯ ЗОРКІ**

Кіно **„СПАРТАК"** — Выдатны маста кі фільм **КРЫЛЛІ ХАЛОПА** Гістарычная драма ў 8 ч.

Беларускі дзяржаўны медыцынскі інстытут

АБ'ЯЎЛЯЕ, ШТО студэнты-выпускнікі медінстытута

для абароны дыпломных работ

БУДУЦЬ ВЫКЛІКАЦЦА ў Менск кожны асабіста.

Без папярэдняга выкліку прыязджаць у Менск не патрэбна.

ДЫРЭКЦЫЯ.

УВАГА!

Значна ЗНІЖАНЫ ЦЭНЫ

на

туалетнае мыла „Ленжэт"

усіх гатункаў.

ЯКАСЦЬ ВЫСОКАЯ.

Патрабуйце ва ўсіх магазінах мыла „Ленжэт". **Белленжэт.**

Бюро інвентарызацыі

ПАТРЭБНЫ рахункаводы і статыстыкі.

Звяртацца: плян Воз, 2.

СКОРА!
ЧАПАЕЎ

ГОРСПАЖЫЎСАЮЗ (был. МГРК)

СЁННЯ, 24 лістапада, па Ленінскай вул., д. № 17,

адкрываецца

ПАСЛЯ КАПІТАЛЬНАГА РАМОНТУ

УЗОРНЫ УНІВЕРМАГ

Паступае вялікі выбар

ГАТОВАЙ АДЗЕННЯ, МАНУФАКТУРЫ, ГАЛАНТАРЭІ, ТРЫКАТАЖА, ГАЛОШ і іншых ТАВАРАЎ.

У спецыялізаваным магазіне Горспажыўсаюза № 93 (Ленінская, 13).

Паступіў у продаж вялікі асартымент дэмісезоннага і зімовага гатовага адзення.

Атрыманы і паступілі ў продаж на узорным плодагародніч магазіне Горспажыўсаюза (Ленінская, 1) **паўднёвыя фрукты, розныя сухафрукты, кампот і натуральны мёд.** ЁСЦЬ ВЯЛІКІ ВЫБАР ВІН.

З 23 лістапада па Ленінскай, 4 АДКРЫВАЕЦЦА ЎЗОРНЫ МАГАЗІН прахладжальных напіткаў. **ГОРСПАЖЫЎСАЮЗ**

ГУЛЫМІ ДНЯМІ
ЧАПАЕЎ

Школа ФЗВ пры Магілеўскай шаўковай фабрыцы

АБ'ЯЎЛЯЕ

НАБОР ВУЧНЯЎ

па спецыяльнасці прадзільшчыкаў —30 асоб і матальшчыц—30.

Усяго 60 асоб.

У школу прымаюцца дзеці рабочых калгаснікаў, служачых, беднякоў і сераднякоў. Узрост—17-19 год. Адукацыя 5—6—7 класаў. Вучні забяспечваюцца стыпендыяй ад 40 да 74 р. у м-ц, інтэрнатам, сталовай і прадуктовымі карткамі па 1 спісу і катэгорыі.

Тэрмін навучання 10 месяцаў.

Заявы прымаюцца да 30 лістапада 1934 г. Заняткі пачынаюцца 5 снежня. Да заявы патрэбна прыкласці дакументы: аб нараджэнні, аб адукацыі, соцстановішчы бацькоў, на адказ паштовых марок на 40к. Без дакументаў заявы не разглядаюцца. Іх вышлю патрэбна ў сваім раёне атрымаць пашпарт.

Адрас: гор. Магілеў, Быхаўскае шасе, берег № 4, школа ФЗВ.

Загадчык ФЗВ **Дзянісік.**

УКРАДЗЕНЫ конь вёсна-гнядой масці; хвост падрэзаны; гарыць на абодвух бакі. Прашу паведамляць за ўзнагароду ў 100 руб. па адрасу: БССР, Бярэзінскі раён, Первавозкага сельсавета, в. Асмалоўль. БОНДАРУ ФЕДАРУ.

Замяшк. вне БДТ-1 тэл. № 24905

Беларускі Дзяржаўны Тэатр

оперы і балета

Маставіцкі кіраўнік—засл. арт. рэсп. І. А. ГІТЕРБІЦ.

СЁННЯ, 24 лістапада ОПЕРА

ПІКАВАЯ ДАМА м у з. Чайкоўскага

Пастаноўка рэжыс. Маск. маставіц. тэатра ЦЕК СССР імя М. Горкага Б. А. Мардвінкіна.

Білеты, купленыя на 6 лістапада, сапраўдны на сёння, 24-XI—34 г. Заставшыяся білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12-2 і з 5-8 г. і ў рабкасе з 12-2 і з 4-6 гадз. веч.

ГОРСПАЖЫЎСАЮЗ Кір. грамадск. харч. **АДКРЫЎ** па Ленінскай вул. д. № 28, радам з поштай

НОВУЮ КАФЕЙНУЮ

У БУФЕЦЕ ВЯЛІКІ ВЫБАР ГАРАЧЫХ І ХАЛОДНЫХ ЗАКУСАК

ЦЭНЫ АГУЛЬНАДАСТУПНЫЯ.

КАФЕЙНАЯ адкрыта з 8 гадз. раніцы да 12 гадз. ночы.

Менскае аддзяленне Белдзяржтранса

ПРЫСТУПІЛА

ДА ПЕРАВОЗКІ ГРУЗАЎ

у Астрашыцкі Гарадок, у Лагойск, Смілавічы, Чэрвень і Бярэзіна.

Просьба да ўсіх арганізацый, прадпрыемстваў і устаноў гор. Менска і раёнаў, маючых патрэбу ў транспартных сродках для перавозкі грузаў у вышаказаныя пункты, звярнуцца ў эксплятацыйны аддзел Менскага аддзялення БЕЛДЗЯРЖТРАНСА, Маскоўская, 3.

ПЛАН СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАЎ

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

на 25 лістапада

№ № выб. участкаў	Выбарчы ўчастак і назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.	Лік выбарч.	Час сходу	Месца сходу	Дакладчык
91	Фабрыка імя Кагановіча (2-я змена)		16	На фабрыцы	Ьарончанка
92	Швэйная ф-ка „8 сакавіка", Белшвэйтрэст, лабараторыя, ЦП саюза швэйнікаў	410	15	Дом тэхнікі	Блофштэйн
93	Завод „Беларусь"	200	16	Сталовая завода	Варавецкі
94	Завод малочных кіслот, завод „Пролетарый" (дражджавы), Бетонны завод.	195	17	Сталовая завода Малочных кіслот	Астроўскі
95	Спіртазавод. Белдзяржспірт	290	16	Клуб спіртазавода	Бэр
96	2-я паліклініка, санэтанцыя, дэзстанцыя	241	21	2-я паліклініка	Майзіт
97	Дзіцячы дом № 2, Дзіцячая клініка, 1-шы рада. дом, Інстытут АММ.	262	20	Клуб медработнікаў	Петрова
98	Завод „Ударнік"	323	16	Ленкуток завода	Фралоў
99	Белдзяржвыдавецтва, Партыдавецтва, Ваенвыдавецтва, ОГІЗ РСФСР	318	16	Дом друку (Камароўка)	Гурло
100	Хімфармазавод, Саюзхімабыт	165	16	Сталовая завода	Гурэвіч(наркум)
101	Таргсінг (белкантора і база), Наркамунгандаль, Белснабсбыт. Мен. аддзяленне Белснабсбыта, Райсаюз, Упаўнаркамхарч, ЗРК „Ваенны Будаўнік"	429	19	Клуб імя VII з'езда	Мяжуеў
102	Мікрабіялагічны інстытут, тубінстытут, Начны сухотны дыспансер, Інстытут аховы здароўя, Дом санасветы, Цэнтральная малочная кухня	167	16	Памяшканне Мікрабіялагічнага інстытута	Баршчаўская
103	Служба эксплаатацыі (пасажыр.) 1-я змена.		18	Клуб XIII-годдзя	Шулькін
104	Наркамат мясцовай прамысловасці, Наркомсабез, Курсы чырв. дырэктароў, упаўнаркамхарчпрома і ўпаўнаркомлегпрома, Рэмманітрэст, Металабыт Белметатрэст, База Металтрэста, інспекцыя Наркомлегпрома	384	18	Клуб металістаў	Кудзельскі
105	Вагоннае дэпо і служба спальных вагонаў (праваднікі)	150	15	Чырвоны куток праваднікоў	Эгле
106	Кансерваторыя, музтэхнікум, музшкола	301	19	Зала кансерваторыі (Універсітэцкая, 45)	Дзядовіч
107	Работнікі тэатраў: Оперы і балета, БДТ-І, Яўрэйскага Польскага, Юнага глядача, ТЮАМ, Тэатра канцэрацыі, ЦЭВ, тэатральныя майстэрні, ЦП союза рабіс, курсы калгасных драмгурткоў		12	Белдзяржтэатр	Вальфсон
108	Групком № 4—рэмкантора Менгоржылсаюза	825	19	Клуб будаўнікоў	Сухаручнік
109	Медінстытут (студэнты 2, 3, 4 і 5 курсаў і 4-га курса рабфака)	1000	20	Актавая зала БДУ	Гельфанд
109	Горспажыўсаюз (МГРК) работнікі вяч. змен		11	Клуб 7-га з'езда профсаюзаў	Верба

ПЛАН ВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

на 25 лістапада

№ выб. участкаў	Выбарчы участак (назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый)	Лік выбарч.	Час пачэння сходу	Месца сходу	Упаўнаважаны
1	Завод „Комунар"	915	11 гадзін	Кіно „Чырв. зорка"	Хадасевіч
2	Тэхнікум сувязі, сталоўка тэхнікума	506	19 „	Клуб тэхнікума сувязі	Егорычаў
3	Работнікі сельгосбанка, Усекабанка, Комунбанка, Промбанка, Дзяржбанка і Крэдытбюро	383	19 „	Дзяржбанк	Алёхін
4	Вагоннае дэпо і служба спальных вагонаў (Абменны пункт, пункт агляду, праваднікі, змаччыкі, электрастанцыя, Сярэдні рамонт, кантора)		20 „	Клуб імя Леніна (пасажырская)	Кузняцоў (ГК КП(б)
5	Школы № № 18, 32, 26, 30, 7, 42, 8, 10, 21, 15, 28, 11, 13, 24, 2, 5, 16, 24, 17, 4 і работнікі ЦП союза працаветы	621	20 „	Дом працаветы (Комуністычная вул.)	Грынкевіч
6	Друкарня імя Сталіна		11 „	Яўрэйскі тэатр	Гераўкер
7	Цэнтральная рабочая паліклініка, ЦДД, Хуткая дапамога	270	21 „	Цэнтральная рабочая паліклініка	Сулькіна

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст.метранпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр—КАГАН Б., ст. друкар—АНУЧЫН. Уп. Галоўлітбела № К—6302.